Клічуць стадыёны на футбол

СТАР. 6

«Песняры» і іх клоны

СТАР. 8

Якога колеру Айчына?

СТАР. 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 САКАВІКА 2014 г. СУБОТА № 58 (27668) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Вынікі выбараў

КАМУ ЛЮДЗІ ДАВЯРАЮЦЬ

Саветы абнавіліся менш чым напалову

Усе 1328 мясцовых Саветаў дэпутатаў Беларусі сфарміраваны ў правамоцным складзе. Пра гэта ўчора на пасяджэнні Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў паведаміў сакратар ЦВК Мікалай Лазавік.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ Ў ЛІЧБАХ

У выніку выбараў у Беларусі сфарміравана 6 абласных і Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў, 118 раённых, 10 гарадскіх Саветаў у гарадах абласнога падпарадкавання, 14 гарсаветаў у гарадах раённага падпарадкавання, 25 пасялковых і 1154 сельскія Саветы, паведамляе БЕЛТА. «Усе Саветы сфарміраваны ў правамоцным складзе, і, у адпаведнасці з заканадаўствам, на працягу месяца павінны правесці арганізацыйныя сесіі, гэта значыць, прыступіць да выканання сваіх абавязкаў», — сказаў сакратар ЦВК.

У чатырох выбарчых акругах выбары не праводзіліся, у трох акругах балатавалася па адным кандыдаце, якія не набралі неабходнай колькасці галасоў. Выбарчых акруг, у якіх выбары прызнаны несапраўднымі, няма.

БОЛЬШ УСВЯДОМЛЕНЫ ЎДЗЕЛ

Старшыні абласных і Мінскай гарадской выбарчых камісій далі справаздачу перад кіраўніцтвам ЦВК пра тое, як кампанія прайшла ў рэгіёнах і сталіцы. Істотных парушэнняў зафіксавана не было, выбары прайшлі арганізавана, у дэмакратычнай і дзелавой абстаноўцы, адзначалася падчас пасяджэння.

Высокую адзнаку старшыні абласных камісій далі зменам і дапаўненням у выбарчым заканадаўстве. Так, участковыя камісіі ўпершыню разам з запрашэннем наведаць выбарчы ўчастак рассылалі выбаршчыкам інфармацыйныя матэрыялы пра кандыдатаў у дэпутаты. Гэта дапамагло павялічыць яўку выбаршчыкаў, паколькі яны маглі загадзя скласці думку пра кандыдатаў, якія балатуюцца па іх акругах, і зрабіць усвядомлены выбар.

Са Br100 млрд, вылучаных на правядзенне мясцовых выбараў, было сэканомлена Br22 млрд.

АМАЛЬ ТРАЦІНА КАНДЫДАТАЎ-ПАРТЫЙЦАЎ АТРЫМАЕ МАНДАТ

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына нагадала, што сярод зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты прадстаўнікоў партый было 748. З іх абрана 248 чалавек, ці каля 30%, і гэта нядрэнны паказчык, лічыць кіраўнік ЦВК.

«Прынамсі, з зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты больш за 3% былі партыйцы. Думаю, сярод выбаршчыкаў членаў партый не больш. Гэта значыць, як яны сацыяльна прадстаўлены ў грамадстве, так яны былі прадстаўлены і ў выбарчай кампаніі», — сказала старшыня Цэнтрвыбаркама.

Кіраўніца ЦВК звярнула ўвагу, што ўласна партыйнага вылучэння на мясцовых выбарах было мала. Шмат якія партыйцы вылучаліся шляхам збору подпісаў.

З 18 тысяч 809 дэпутатаў мясцовых Саветаў толькі 1,3% — прадстаўнікі палітычных партый.

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ УКАМПЛЕКТАВАНА

Цэнтральная камісія Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў таксама падвяла вынікі паўторных выбараў дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання ў Гомельска-Навабеліцкай выбарчай акрузе № 36 і зарэгістравала дэпутатам па гэтай выбарчай акрузе Алену Астапюк.

Яна набрала больш за 76% галасоў выбаршчыкаў. Выбары дэпутата парламента праходзілі на альтэрнатыўнай аснове. У бюлетэні для галасавання былі прозвішчы яшчэ двух кандыдатаў: Мікалая Шкірэева, які набраў у выніку каля 8% галасоў, і Віктара Хоміча, яго вынік — каля 7%.

НАСТУПНЫЯ ВЫБАРЫ — ПРЭЗІДЭНЦКІЯ

«Выбары павінны праходзіць не пазней, чым за два месяцы да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў, гэта значыць, не пазней за 20 лістапада 2015 года», — удакладніла старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына.

Прэзідэнцкая выбарчая кампанія доўжыцца тры месяцы. «Калі мы гаворым пра 20 лістапада, то, такім чынам, не пазней 20 жніўня выбары павінны быць прызначаны», — сказала кіраўніца ЦВК.

Лідзія Ярмошына паведаміла, што зменіцца ў прэзідэнцкай выбарчай кампаніі з улікам прынятых паправак у выбарчае заканадаўства. Асабістыя выбарчыя фонды прэтэндэнтаў на пост прэзідэнта дазволена стварацьяшчэ да таго, як яны афіцыйна стануць кандыдатамі, гэта значыць, ужо з рэгістрацыі ініцыятыўных груп. З гэтага моманту ўдзельнікі перадвыбарнай гонкі змогуць аплачваць выдаткі. Павялічаны і памер асабістых выбарчых фондаў кандыдатаў у прэзідэнты — з 3 да 9 тысяч базавых велічынь (адна ББ пакуль складае Br130 тыс.)

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю работу **2 красавіка 2014 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **2 красавіка 2014 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

СОНЕЧНАЕ НАТХНЕННЕ

г. Мінск.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІЧБА ДНЯ

Br7 млн 233 тысячы

склала сярэдняя заработная плата ў Мінску ў лютым гэтага года. Гэта на 1 млн 844 тысячы вышэй, чым сярэдняя зарплата па рэспубліцы. У студзені-лютым 2014 года намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Мінска склала Br7191,5 тыс., у тым ліку ў лютым — Br7233 тыс., і павялічылася ў параўнанні са студзенем 2014 года на 0,9%. Рэальная заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі, у студзені-лютым 2014 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2013-га павялічылася на 7,4%, у лютым 2014-га ў параўнанні са студзенем — паменшылася на 1,1%. Найбольш высокааплатнымі ў сталіцы ў лютым былі работнікі арганізацый, звязаных з вылічальнай тэхнікай і фінансавай дзейнасцю. Сярэдняя заработная плата работнікаў у гэтых арганізацыях склала адпаведна Br15512,5 тыс. і Br12346 тыс.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.03.2014 г.

Долар ЗША	9870,00	▲
Еўра	13570,00	▼
Рас. руб.	277,00	■
Укр. грыўня	881,25	▼

■ Напярэдадні чэмпіянату

ТРАНСПАРТНІКІ ГАТОВЫЯ. ПАЕХАЛІ!

У Міністэрстве транспарту і камунікацый на пасяджэнні падкамітэта па пытаннях дарожнага будаўніцтва і транспартнага забеспячэння арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні сёлета чэмпіянату свету па хакеі былі разгледжаны пытанні работы транспарту падчас вышэйназванага мерапрыемства.

НА МАРШРУТЫ — ДАДАТКОВЫЯ АЎТОБУСЫ

У адпаведнасці з Планам дзеянняў Мінскага гарвыканкама па забеспячэнні транспартнага абслугоўвання ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату свету па хакеі прадугледжана закупка 150 аўтобусаў. Летась набылі 114 аўтобусаў і 10 тралейбусаў. У красавіку МАЗ паставіць яшчэ 36 аўтобусаў для выканання гарадскіх перавозак; 20 аўтобусаў «МАЗ-251» для абслугоўвання камандаў-удзельніц чэмпіянату; 10 аўтобусаў «МАЗ-107» павышанай камфортнасці для перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах у Нацыянальны аэрапорт Мінск.

Акрамя таго, для транспартнага забеспячэння ў перыяд правядзення чэмпіянату ААТ «Гомельаблаўтатранс» пастаўлены 3 аўтобусы «МАЗ-251» і ў красавіку будуць пастаўлены яшчэ 7 такіх аўтобусаў.

Мінгарвыканкам зацвердзіў 11 мэтавых маршрутаў пасажырскага транспарту падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі: «АВ «Цэнтральны» — «Мінск-Арэна»; «АВ «Цэнтральны» — Студэнцкая вёска»; «АВ «Цэнтральны» — «Чыжоўка-Арэна»; «Мінск-Арэна» — «Чыжоўка-Арэна»; «Студэнцкая вёска — Нацыянальны аэрапорт «Мінск»; «Студэнцкая вёска — «Мінск-Арэна»; «Студэнцкая вёска — «Чыжоўка-Арэна»; «Ст. м. «Аўтазаводская» — «Чыжоўка-Арэна»; «П.п. «Лошыца» — «Чыжоўка-Арэна»; «Ст. м. «Няміга» — «Мінск-Арэна»; «Ст.м. «Пушкінская» — «Мінск-Арэна».

Арганізавана работа аўтобусаў па маршруце № 300Э «Мінск — Нацыянальны аэрапорт «Мінск» з прывязкай іх адпраўлення да раскладу руху паветраных суднаў. У перыяд правядзення чэмпіянату свету інтэрвал руху аўтобусаў у Нацыянальны аэрапорт Мінск складзе не больш за 30 хвілін, у пікавы час — не больш за 15 хвілін.

У сталічным метрапалітэне на ўсіх 25 станцыях праведзена ўладкаванне абмежавальных шуц-ліній па краях платформ. Перааформлены касавыя вокны і схемы ліній метрапалітэна, размешчана дадатковая інфармацыя на англійскай мове.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫГУНКА ВІТАЕ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ

На чыгуначных вакзалах станцый «Мінск-Пасажырскі» і «Брэст-Цэнтральны» з 7 па 25 мая будуць кругласутачна працаваць каардынацыйныя цэнтры для вырашэння пытанняў, звязаных з сустрэчай-провадамі ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату, якія будуць прыбываць (выбываць) чыгуначным транспартам. Акрамя існуючых міжнародных кас выдзелены дадатковыя спецыялізаваныя касы для продажу білетаў замежным грамадзянам.

СТАР. 2

■ Курсавая розніца

КЛІН КЛІНА ВЫБІВАЕ

Нездарма так кажуць у народзе. Абвастрэнне адносін Расіі з Захадам паказала трапнасць і натуральнасць гэтага сцвярджэння — расійскі рубель пасля санкцый пачаў расці.

Мы ўжо пісалі аб тым, што ў многім на гэты рост паўплываў абавязак па выплаце падаткаў у нацыянальнай валюце прадпрыемствамі. Аднак палітычная сітуацыя адыграла сваю ролю. Расійская эканоміка, якая апошнім часам, мякка кажучы, паказвала не лепшыя вынікі, атрымала дадатковы шанц на выжыванне. Па-першае, згуляе на карысць Расіі павышэнне кошту на нафту, справакаванае чаканнямі дэфіцыту гэтай сыравіны. Справа ў тым, што, скажам, Злучаныя Штаты могуць сабе дазволіць адмовіцца ад расійскай нафты, а для Еўропы гэта будзе балючым крокам. Па-другое, рускія бізнесмены, якія маюць вялікія капіталы, на хвалі патрыятызму ўкладваюць грошы на сваёй тэрыторыі. А па-трэцяе (і гэта самае цікавае), самі санкцыі супраць Расіі сталі нікому не патрэбнымі. Гэта вынікае з нядаўняй заявы нямецкага канцлера Ангелы Меркель: «Захад не дасягнуў ступені, якая прадугледжвае ўвядзенне эканамічных санкцый». Канцлер лічыць, што ўкраінскі крызіс павінен быць ліквідаваны дыпламатычным шляхам.

Наша нацыянальная валюта, на жаль, не можа пахваліцца павышэннем. Долар падаражэў на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9870. Еўра на пачатку тыдня значна вырасла, а пасля стала зніжацца. У выніку — падаражэнне на 20 рублёў (плюс 0,1%) да 13570. Расійскі рубель адыграў адразу 6,5 грашовай адзінкі (плюс 2,4%) да 277.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯНУКОВІЧ ЗАКЛІКАЎ ЗАМЕСТ ВЫБАРАЎ ПРАВЕСЦІ РЭФЕРЭНДУМ АБ ВЫЗНАЧЭННІ СТАТУСУ КОЖНАГА РЭГІЁНА УКРАІНЫ

Віктар Януковіч у чарговым сваім звароце заклікаў замест выбараў правесці рэферэндум аб вызначэнні статусу кожнага рэгіёна Украіны. «Як прэзідэнт, які з вамі думкамі і душой, заклікаю кожнага разважлівага грамадзяніна Украіны — не дайце самазванцам вас выкарыстоўваць. Патрабуйце правядзення рэферэндуму аб вызначэнні статусу кожнага рэгіёна ў складзе Украіны», — сказаў Віктар Януковіч. На яго думку, унесеныя ў заканадаўства Украіны змены, у тым ліку аб выбарах прэзідэнта Украіны, «выключаюць магчымасць сумленных выбараў, калі б яны ні адбыліся». Віктар Януковіч таксама папрасіў Партыю рэгіёнаў Украіны выключыць яго з гэтай партыі.

«НЕ Ў ГРОШАХ ШЧАСЦЕ», ВЫСВЕТЛІЛІ БРЫТАНСКІЯ САЦЫЁЛАГІ

Брытанскія і амерыканскія сацыёлагі апублікавалі вынікі даследаванняў, што паказваюць, прадстаўнікі якіх прафесій больш за ўсё задаволены сваёй працай. Вынікі аналітыкаў са Злучанага Каралеўства і Штатаў разышліся, але паказальным стала тое, што ўзровень заработнай платы не заўсёды вызначаў узровень «шчасця» і задаволенасці работніка. Сацыёлагі прыйшлі да высновы, што больш высокі ўзровень заработнай платы не рабіў іх рэспандэнтаў больш шчаслівымі — куды важнейшым аказалася ўсведамленне чалавека, што ён сваёй працай прыносіць карысць грамадству. Мае значэнне, зразумела, таксама асабістая схільнасць да той ці іншай працы. Напрыклад, святары з прыбыткам 34 тысячы долараў за год і фермеры, якія зараблялі каля 40 тысяч, аказаліся нашмат больш шчаслівымі за інжынераў, гадавы даход якіх — 64,7 тысячы долараў. Як высветлілі сацыёлагі, найбольш задаволены сваёй працай прадстаўнікі духавенства. За імі ішлі топ-менеджары і высокапастаўленыя чыноўнікі, менеджары і ўладальнікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, спецыялісты па кіраванні якасцю і тэхнічным рэгуляванні, менеджары ў сферы аховы здароўя, урачы-практыкі, фермеры, уладальнікі гасцініц. У топ-10 трапілі таксама электрыкі і майстры па метале. А вось самымі няшчаснымі сябе адчувалі ўладальнікі бараў і супрацоўнікі месцаў, дзе дазволены продаж алкаголю.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

МАСКВА ВЫРАШЫЛА АДМЯНІЦЬ ПАГАДНЕННІ З КІЕВАМ ПА ЧАРНАМОРСКІМ ФЛОЦЕ

Прэзідэнт Расіі 27 сакавіка ўнёс у Дзяржду прапанову аб спыненні дзеяння шэрагу дагавораў з Украінай, у тым ліку пагадненняў аб Чарнаморскім флоце. Пра гэта паведамляецца на сайце Крамля. Раней спыніць дзеянне гэтых дамоўленасцяў аб ЧФ прапанаваў Савет бяспекі Расіі. Гаворка ідзе аб падпісаных у 1997 годзе пагадненнях аб падзеле Чарнаморскага флоту, аб статусе і ўмовах знаходжання флоту на тэрыторыі Украіны, аб узаемаразліках, звязаных з падзелам ЧФ і знаходжаннем флоту на ўкраінскай тэрыторыі, а таксама аб пагадненні па пытаннях знаходжання ЧФ, падпісанага ў Харкаве ў 2010 годзе.

Як гаворыцца ў тлумачальнай запісцы, прадмет гэтых пагадненняў страчаны з прычыны таго, што Крым прынялі ў склад Расіі.

КОРАТКА

МЗС Беларусі атрымала па дыпламатычных каналах інфармацыю аб тым, што з 11 красавіка г.г. у Турэцкай Рэспубліцы ўводзяцца новыя правілы ўезду ў краіну. Візы для турыстычных або дзелавых паездак будуць выдавацца праз новую электронную сістэму.

У Беларусі зацверджаны правілы атэстацыі арганізацый і спецыялістаў у галіне будаўніцтва. Пастановай зацверджана палажэнне аб атэстацыі кіраўнікоў, спецыялістаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць дзейнасць у архітэктурнай, горадабудаўнічай, будаўнічай галіне, выконваюць работы па абследаванні будынкаў і збудаванняў.

ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь» забяспечыла ў 2013 годзе максімальны аб'ём транзіту прыроднага газу за апошнія пяць гадоў у памеры 48,8 млрд куб. м і дасягнула гістарычнага максімуму транзіту па газаправодзе Ямал-Еўропа — 34,7 млрд куб.м.

Кошт будаўніцтва мемарыяльнага комплексу ў Трасцянцы складзе каля 10 млн еўра. Кошт першай чаргі будаўніцтва мемарыяла, якая, магчыма, пачнецца ўжо ў красавіку гэтага года, складзе 5 млн еўра. На добраўпарадкаванне тэрыторыі Трасцянца ў 2014 годзе Мінгарвыканкамам выдаткавана каля 200 тыс. еўра.

■ Балючая тэма

«ВІНАВАТЫ ТОЛЬКІ Я»...

Гэтыя словы ў пасмяротных запісках непаўналетніх самазабойцаў сустракаюцца часцей за ўсё

Зусім свежы прыклад. Малады чалавек збіраўся выкінуцца з акна інтэрната ў Бялынічах. Але гэта своечасова ўбачылі прахожыя і паспелі патэлефанаваць выратавальнікам. Цяпер хлопец знаходзіцца на лячэнні. А колькі прыкладаў, калі чалавек выносіць сабе смяротны прысуд і даводзіць яго да канца... Паводле статыстыкі, штодня больш за 1000 маладых людзей у свеце спрабуюць здзейсніць суіцыд, і ў аднаго са 100 гэта атрымліваецца. Сацыёлагі кажуць, што на працягу апошняга дзесяцігоддзя колькасць суіцыдаў сярод моладзі ўзрасла амаль у 3 разы. Толькі на Магілёўшчыне з пачатку гэтага года скончылі жыццё самагубствам 2 падлеткі.

За краем

У лютым у Чэрыкаве пахавалі 16-гадовага юнака. Яго знайшлі павешаным на гарышчы дома, дзе ён жыў. Здарылася гэта пасля таго, як ён пасварыўся са сваёй сяброўкай, ляпнуў дзвярыма і кудысьці пабег. А праз паўгадзіны стала вядома, што здарылася непапраўнае. Нельга казаць, што менавіта сварка стала прычынай яго зыходу з жыцця. Ён нават не выказваў такіх думак. Але дзесьці нешта пайшло не так, і гэта непрыемная для яго размова, магчыма, стала апошняй кропляй.

Маладосць і смерць — несумяшчальныя паняцці. І калі яны стаяць побач, здаецца, што гэта нейкая недарэчнасць, якую трэба выправіць. Але такое магчыма толькі ў казках. Ці ведаюць аб гэтым тыя, хто накідвае пятлю сабе на шыю ці сасковае з даху? Здаецца, ведаюць. Але чамусьці ўсё роўна робяць гэты фатальны крок.

Дарэчы, па словах магілёўскіх праваахоўнікаў, на працягу года з жыцця сыходзяць каля 7-8 непаўналетніх жыхароў вобласці.

СТАР. 14

ЗАРОБКІ Ў РАБОТНІКАЎ ДАШКОЛЬНЫХ УСТАНОЎ ПАВЯЛІЧАЦЦА

А бацькі будуць цалкам пакрываць выдаткі на харчаванне дзяцей

З 1 красавіка заработная плата работнікаў дашкольных устаноў павысіцца. Такое рашэнне змяшчаецца ў Пастанове Савета Міністраў № 265 ад 27 сакавіка 2014 года.

Як паведамляе прэс-служба беларускага ўрада, рост заробку педагагічных работнікаў адбудзецца праз павышэнне надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі. Так, надбаўка за другую катэгорыю павялічыцца з 15% да 25%, за першую катэгорыю — з 20% да 40% і за вышэйшую катэгорыю — з 30% да 60%. Сёння розніца паміж надбаўкамі выхавальніка, які мае другую кваліфікацыйную катэгорыю, і выхавальніка з вышэйшай катэгорыяй складае ўсяго 175 тысяч рублёў. А з 1 красавіка яна складзе 405 тысяч. У прэс-службе падкрэсліваюць, што павелічэнне надбавак скіравана, у першую чаргу, на стымуляванне творчых педагогаў, выключэнне ўраўняльнага падыходу да аплаты працы і захаванне кваліфікаваных кадраў у галіне.

Што тычыцца педагогаў, якія не маюць кваліфікацыйнай катэгорыі, то ім з 1 красавіка павялічаць на 10% тарыфныя аклады. На такі самы працэнт будуць павялічаны тарыфныя аклады кіраўнікам устаноў дашкольнай адукацыі, іх намеснікам па асноўнай дзейнасці, шэф-кухарам, кухарам дзіцячага харчавання і кухонным рабочым. І на 20% павялічацца тарыфныя аклады ў памочнікаў выхавальнікаў.

У той жа час з 1 красавіка пераглядаюцца і ўмовы аплаты бацькамі кошту харчавання дзяцей у дашкольных установах. Калі да апошняга часу бацькі пакрывалі 60% ад дзейных нормаў выдаткаў на харчаванне аднаго выхаванца, то цяпер яны будуць аплачваць 100% выдаткаў на харчаванне. Пры гэтым кола катэгорый, якія карыстаюцца льготамі па аплаце за харчаванне дзяцей, пашырылася. Так, на 30% будзе зніжана плата за харчаванне для сем'яў, у якіх двое дзяцей наведваюць дашкольную установу, на 50% — для апекуноў, прыёмных бацькоў, бацькоў-выхавальнікаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, дзіцячых вёсак (гарадкоў).

У асобных установах недахоп выхавальнікаў складае ад 8 да 12 ставак. Звычайнай стала і практыка работы выхавальнікаў без памочнікаў.

Як і раней, плата за харчаванне не будзе спаганяцца з бацькоў дзяцей-інвалідаў, дзяцей з анкалагічнымі захворваннямі, хворых на туберкулёз, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека, а таксама з членаў сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі (памерлі) пры выкананні воінскага або службовага абавязку. Плата для сем'яў, якія маюць траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама сем'яў, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання, па-ранейшаму будзе складаць 50%.

Зараз выдаткі бюджэту на аднаго выхаванца ва ўстанове дашкольнай адукацыі складаюць у сярэднім 1,5 мільёна рублёў за месяц, а бацькі аплачваюць усяго 20% ад агульных выдаткаў. З 1 красавіка бацькі будуць пакрываць у поўным аб'ёме толькі кошт набору прадуктаў харчавання, гэта значыць, што плата бацькоў павялічыцца ў сярэднім на 150 тысяч рублёў.

Сродкі, сэканомленыя ў бюджэце ў выніку аптымізацыі ўдзелу бацькоў у аплаце харчавання сваіх дзяцей, будуць накіраваны на павышэнне заробку работнікам дашкольных устаноў.

У ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, куды мы звярнуліся па каментарыі, журналісту «Звязды» паведамілі, што сёння заработная плата выхавальніка складае 2,6—2,7 мільёна рублёў, а памочніка выхавальніка — 1,5 мільёна рублёў. Менавіта таму пытанне павелічэння заробку работнікам устаноў дашкольнай адукацыі рэгулярна ўзнімалася галіновым прафсаюзам на ўсіх узроўнях, у тым ліку на парламенцкіх слуханнях, у звароце да беларускага ўрада. У 2013 годзе адбылося нязначнае павелічэнне тарыфных ставак выхавальнікаў (на 25%) і памочнікаў выхавальнікаў (на 10%), пасля чаго іх заробак вырас на 12-13% і 7% адпаведна. А па іншых катэгорыях работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі памеры заробкаў даўно не пераглядаліся.

Нядзіўна, што ва ўстановах дашкольнай адукацыі вельмі востра адчуваецца дэфіцыт кадраў, асабліва гэта тычыцца сталіцы. У раздзеле «Вакансіі» на сайце Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама змяшчаецца інфармацыя пра патрэбу ў больш чым 670 выхавальніках. Самая вялікая колькасць вакансій — ва ўстановах дашкольнай адукацыі Заводскага, Фрунзенскага і Маскоўскага раёна ў сталіцы. У асобных установах недахоп выхавальнікаў складае ад 8 да 12 ставак. Востра не хапае памочнікаў выхавальнікаў, кухараў і кухонных рабочых. Па прычыне адсутнасці кухараў прыгатаваннем страў у шэрагу выпадкаў вымушаны займацца і загадчыкі дашкольных устаноў, і іх намеснікі. Праца выхавальнікаў, памочнікаў выхавальнікаў звыш працоўнага часу, на жаль, стала нормай. Звычайнай стала і практыка работы выхавальнікаў без памочнікаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Выклікае трывогу і сітуацыя з забеспячэннем устаноў дашкольнай адукацыі кваліфікаванымі кадрамі з прафільнай педагагічнай адукацыяй. З аднаго боку, колькасць выхавальнікаў з вышэйшай адукацыяй расце, а з другога боку, далёка не заўсёды яны маюць вышэйшую адукацыю па профілі «Педагогіка дзяцінства», больш за тое, нават не заўсёды маюць педагагічную адукацыю.

У ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі падлічылі, што пасля ўступлення ў сілу з 1 красавіка пастановы ўрада рост заработнай платы работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі складзе ад 8 да 16% (гэта яшчэ і з улікам росту з 1 красавіка тарыфнай стаўкі першага разраду).

Вось толькі наколькі істотна такое павышэнне паўплывае на кадравую сітуацыю і ці дапаможа гэты захад утрымаць кадры ў галіне? Адказ на гэтае пытанне мы хутка атрымаем...

Надзея НІКАЛАЕВА.

НАШЫХ МЫТНІКАЎ НЕ ПАДМАНЕШ

Супрацоўнікі Віцебскай мытні канфіскавалі аўто «Міцубісі» коштам 215 мільёнаў рублёў.

— Аўтамабіль быў яшчэ зімой афармлены на пункце мытнага афармлення грамадзянінам Латвіі як транспартны сродак для асабістага карыстання па адпаведнай працэдуры часовага ўвозу. Але потым на машыне ездзіў грамадзянін нашай краіны, які пражывае ў Полацкім раёне. У выніку было парушана заканадаўства ў рамках Мытнага саюза. Згодна з ім, іншаземец не можа перадаваць правы карыстання або распараджэння часова ўвезеным транспартным сродкам іншай асобе, — паведамілі «Звяздзе» ў мытні.

Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжвае накладанне штрафу — ад 5 да 30 базавых велічынь з канфіскацыяй транспартных сродкаў незалежна ад таго, у чыёй уласнасці яны знаходзяцца, або без канфіскацыі. Прычым за незаконную перадачу замежнага аўтамабіля адказвае не толькі той, хто на ім прыехаў, але і той, хто ім кіраваў потым.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

45 МОЎ ЗАГУЧАЦЬ НА ФЕСТЫВАЛІ АДНАЧАСОВА

Другі Мінскі фестываль моў пройдзе 30 сакавіка на філалагічным факультэце БДУ. У гэты дзень увазе гасцей будуць прадстаўлены 45 моў свету — як сучасных і папулярных, так і малавядомых, а таксама тых, што выйшлі з ужытку.

У межах гэтай унікальнай акцыі адбудуцца дзесяць навукова-папулярных, лінгвістычных лекцый і сустрэч з носьбітамі розных моў. Госці змогуць наведаць прэзентацыі — захапляльныя 40-хвілінныя міні-лекцыі па гісторыі і развіцці канкрэтнай мовы, яе станаўленні і сучасным стане. Прадстаўляць іх будуць студэнты, аспіранты і выкладчыкі філалагічнага факультэта і факультэта міжнародных адносін БДУ, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, а таксама лінгвісты і мовазнаўцы з Масквы, Санкт-Пецярбурга і Кіева. Прыняць удзел у фестывалі змогуць усе ахвотныя. А напрыканцы дня знаёмства з мовамі завершыцца лінгвістычнай віктарынай.

Першы Мінскі фестываль моў прайшоў год таму: на ім былі прадстаўлены 35 моў і 7 лінгвістычных лекцый. А першы ў свеце фестываль моў быў праведзены ў 1995 годзе ў французскім горадзе Тур і сабраў 800 гасцей. Яго арганізаваў амерыканскі лінгвіст і эсперантыст Дэні Кіф. Ужо ў наступным годзе ў Чабаксарах прайшоў першы расійскі фестываль моў. Затым аналагічныя мерапрыемствы адбыліся ў ЗША, Венесуэле, Кітаі, Бельгіі, Швецыі, Малдове, Украіне і іншых краінах. У многіх гарадах свету правядзенне фестываляў моў ужо паспела стаць штогадовай традыцыяй.

Найбуйнейшым у свеце лічыцца першы кітайскі фестываль, які прайшоў у 2008 годзе ва ўніверсітэце Нанкіна і за два дні сабраў 13500 наведвальнікаў. На ім было прадстаўлена больш як 70 моў і дыялектаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

17 ТОН БУЛЬБЫ АРЫШТАВАЛІ

Супрацоўнікі Наваполацкага міжраённага аддзела фінансавых расследаванняў і ДАІ затрымалі грузавік, на якім без суправаджальных дакументаў везлі з Расіі 17 тон бульбы коштам больш як 78 мільёнаў рублёў.

За рулём грузавога цягача «Рэно» з паўпрычэпам знаходзіўся 27-гадовы жыхар Брэсцкай вобласці, вадзіцель фермерскай гаспадаркі. Высветлілася, што бульбу ён вёз аж з Санкт-Пецярбурга ў Брэсцкую вобласць.

На тавар і аўто быў накладзены арышт. У дачыненні да фермерскай гаспадаркі распачаты адміністрацыйны працэс. За парушэнне прадугледжана законам даволі суровае пакаранне. У прыватнасці, памер магчымага штрафу — да 50 базавых велічынь. Могуць і бульбу канфіскаваць.

У ЗАКІНУТАЙ ВЁСЦЫ... САМАГОННЫ ЗАВОД

У Шаркаўшчынскім раёне ў закінутай вёсцы працаваў міні-завод па вытворчасці самагону, які тут гналі тонамі.

— У драўляным будынку міліцыянеры знайшлі самагонны апарат і ёмістасці з брагай. Канфіскавана больш як 7,3 тысячы літраў самагоннай брагі і 40 літраў самагону. Па гэтым факце праводзіцца праверка, — паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЛЕПШ, ЧЫМ ДЗЕ, КОРМЯЦЬ «У ГАННЫ» І «ЯНКІ»

Міністэрства гандлю разам з Беларускім прафсаюзам работнікаў гандлю падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу «Лепшы рэстаран, кавярня года».

У ім у васьмі намінацыях бралі удзел 14 рэстаранаў, кавярняў усіх формаў уласнасці і падпарадкаванасці. Ад Брэсцкай вобласці былі два ўдзельнікі, ад Віцебскай і Мінскай — па тры, ад Гомельскай і Магілёўскай па адным, ад Гродзенскай вобласці — чатыры ўдзельнікі.

У прыватнасці, «Лепшым рэстаранам, кавярняй года» сталі: рэстаран «Палессе» УП «Гандальсэрвіс» з г.Рэчыцы (дыплом першай ступені), рэстаран «У Ганны» Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі (дыплом другой ступені). Гэтаму ж прадпрыемству належыць і кавярня «Прыазёрны двор «У Ганны», якое стала лепшым прадпрыемствам прыдарожнага сэрвісу. У намінацыі «Лепшы рэстаран, кавярня беларускай нацыянальнай кухні» перамагла кавярня «Янка» УП «Яна-Трэйд» (г. Магілёў). Перамога ў намінацыі «Лепшы аб'ёкт грамадскага харчавання забаўляльнай установы» дасталася начному бару «База» ўнітарнага прадпрыемства па аказанні паслуг «Метро Клуб» з Гродна. «Адкрыццём года», апроч іншых, сталі, напрыклад, дзіцячая кавярня «Верона» ААТ «Школьнік» з Пінска і кавярня «Калізей» УП «Сіці-Шоу» са Слуцкага раёна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ПРЫЗНАЧАНЫ НОВЫ КІРАЎНІК «БЕЛЛЕГПРАМА»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даў згоду на прызначэнне старшынёй Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці Мікалая Яфімчыка, паведамляе БЕЛТА.

Мікалай Васільевіч Яфімчык нарадзіўся ў 1960 годзе ў Салігорскім раёне. У 1982 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, у 2001 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Працаваў у Салігорскім райвыканкаме, кіраўніком калгаса «Старобінскі». З 1997 года быў намеснікам дырэктара па камерцыйных пытаннях ЗАТ «Калінка», а ў 2003 годзе стаў генеральным дырэктарам ААТ «Купалінка». Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

■ Фестываль

ГРАН-ПРЫ ПАЕХАЎ У ВІЛЬНЮС

У Магілёве падвялі вынікі IX Міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форуму «М.@rt.Кантакт.»

На працягу тыдня за галоўны прыз змагаліся творчыя калектывы 9 краін, у выкананні якіх было прадстаўлена 17 спектакляў у розных жанрах. Кожны дзень на сцэне чатырох галоўных пляцовак форуму ішло па 2-3 пастаноўкі, адбываліся майстар-класы, абмеркаванні спектакляў з удзелам крытыкаў і журналістаў. «Я атрымала добры вопыт і шмат станоўчых эмоцый, — адзначыла старшыня журы — народная артыстка СССР і Украіны Ада Рогаўцава. — Уражвала, калі ў пастаноўцы адчувалася глыбіня зместу, яркасць таленту артыстаў. Але тэатр мяняецца. Моладзь больш чакае ад яго нейкага выбуху». Калісьці вельмі яркая падаў сябе на «М.@rt.Кантакце» беларускі рэжысёр Яўген Карняг. Цяпер гэта вядомы далёка за межамі краіны майстар. Менавіта на магілёўскай сцэне адбылося першае станаўленне яшчэ адной яркай тэатральнай «зоркі» — Кацярыны Аверкавай, якая цяпер працуе ў Мінску. Адзначалася і тое, што магілёўскі тэатр таксама за гады існавання форуму ўзняўся на больш высокую прыступку. Невыпадкова спецыяльны прыз IX форуму дастаўся яго актрысе Алене Крыванос за выкананне галоўнай ролі ў пастаноўцы Саўлюса Варнаса «Фрэкен Жулі».

А вось Гран-пры фестывалю журы аднадушна прысудзіла Дзяржаўнаму малому тэатру з Вільнюса, які прыехаў у Магілёў з «гучным» спектаклем Рымаса Тумінаса «Містрас» (аб апошніх гадах жыцця вядомага паэта і публіцыста Адама Міцкевіча). Прыз за лепшую жаночую ролю ўручаны нямецкай актрысе Тэрэзе Вайсбах — галоўнай гераіне спектакля-кабарэ «У бары «У кракадзіла». Лепшым у «мужчынскай» намінацыі стаў артыст мінскага Нацыянальнага акадэмічнага драмтэатра імя М. Горкага Уладзімір Глотаў, сыграўшы Малога ў спектаклі «Аракул?..»

Лепшым маладзёжным спектаклем названа пастаноўка «Злачынства і пакаранне» тэатра-студыі «Невялікі драматычны тэатр» з Санкт-Пецярбурга, а прэмію «Дэбют» атрымаў выканаўца ролі Данілкі ў спектаклі «Раскіданае гняздо» мінскага Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Арцём Курэнь. Спецыяльнымі прызамі адзначаны і некаторыя іншыя акцёры і рэжысёры.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

Адзенне старое аказалася новым

У беларусаў вялікім попытам карыстаецца адзенне, якое прайшло ўцэнку на рынках і ў гандлёвых сетках Еўропы.

Попыт нараджае прапанову, а разам з ім жаданне нядобрасумленных прадаўцоў тавару атрымаць як мага больш прыбытку пры мінімальных выдатках. У сувязі з чым такая вопратка, за якую неабходна было б заплаціць даволі высокія пошліны, увозіцца рэалізатарамі як былая ва ўжыванні.

— У рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Урбаны» мытнікі ў грузавым аўто сярод тавару, заяўленага ў адпаведных суправаджальных дакументах як вопратка і абутак, што былі ва ўжыванні, знайшлі зусім новае адзенне і абутак, без слядоў зносу, з фабрычнымі этыкеткамі і ярлыкамі, — паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскай мытні. Падман потым пацвердзіўся дакументальна — пасля правядзення таваразнаўчай экспертызы. Тавар агульным коштам больш як 516 мільёнаў рублёў канфіскавалі. Праводзіцца праверка.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТРАНСПАРТНІКІ ГАТОВЫЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прапрацавана пытанне праезду балельшчыкаў на матчы чэмпіянату ў міжнародных, міжрэгіянальных зносінах, а таксама цягнікамі гарадскіх ліній у мінскім чыгуначным вузле ў прывязцы да пачатку і заканчэння матчаў, нераўнамернасці правядзення спаборніцтваў па днях тыдня і цягам сутак (пяць перыядаў правядзення матчаў). Графік прадугледжвае транспартныя зносіны з Мінскам у перыяд правядзення чэмпіянату: у міжрэгіянальных зносінах сувязь з абласнымі цэнтрамі як рэгулярнымі, так і дадатковымі цягнікамі — 43 цягнікі штодзённа; у міжнародных зносінах па маршрутах Вільнюс — Мінск, Рыга — Мінск, Санкт-Пецярбург — Мінск, Масква — Мінск, Яраслаўль — Мінск, Астана — Самара — Мінск, Варшава — Мінск як рэгулярнымі, так і дадатковымі цягнікамі — 34 саставы штодзённа.

Цягнікі гарадскіх ліній мэтавага прызначэння (для забеспячэння праезду балельшчыкаў непасрэдна на матчы і пасля іх заканчэння, з улікам размяшчэння спартыўных аб'ектаў «Мінск-Арэна» і «Чыжоўка-Арэна») будуць хадзіць: з 9 па 20 мая ў зносінах Мінск — «Чыжоўка-Арэна» і Мінск — «Мінск-Арэна» — 9 пар; 22 мая ў тых жа зносінах 6 пар; 24 мая ў зносінах Мінск — «Мінск-Арэна» — 6 пар; 25 мая ў зносінах Мінск — «Мінск-Арэна» — 6 пар.

Графік цягнікоў гарадскіх ліній прадугледжвае інтэрвальнасць іх курсіравання ў 10-15 хвілін, троххвілінную стаянку на прыпыначных пунктах «Масюкоўшчына» і «Лошыца» для пасадкі і высадкі балельшчыкаў. Таксама графікам руху цягнікоў гарадскіх ліній прадугледжваецца і скразны рух у зносінах Жданавічы — Мінск-Пасажырскі — Калядзічы.

На чыгуначных вакзалах станцый «Брэст-Цэнтральны», «Гродна» размешчаны элементы прасторавай навігацыі з інфармацыяй на англійскай мове, якая дазволіць арыентавацца на аб'ектах транспарту. На вакзале станцыі «Мінск-Пасажырскі», прыпыначных пунктах «Масюкоўшчына» і «Лошыца» прыведзены ў адпаведнасць інфармацыйныя паказальнікі ў частцы адлюстравання піктаграм і тэкставай інфармацыі на беларускай і англійскай мовах.

На вакзале станцыі «Мінск-Пасажырскі» мадэрнізавана інфармацыйнае табло ў размеркавальным вестыбюлі вакзала з вывадам інфармацыі аб раскладзе руху цягнікоў на англійскай мове. У зале чакання мадэрнізавана інфармацыйная сістэма, устаноўлены сучасныя табло візуальнай інфармацыі са звесткамі на рускай і англійскай мовах.

Фота БЕЛТА.

Мяккага ўсім прызямлення!

Што датычыцца паветранага транспарту, дык з пачатку мінулага года адкрыты новыя авіярэйсы на рэгулярнай аснове і павялічана частата рэйсаў у Самару, Барселону, Кутаісі, Будапешт, Бялград, Жэневу, Калінінград, Кіеў, Рыгу, Варшаву, Маскву, Санкт-Пецярбург, Вільнюс. З 28 красавіка будзе адкрыты рэгулярны авіярэйс у Ніцу, з 30 красавіка — авіярэйс у Краснадар.

Як было адзначана на пасяджэнні, вопыт замежных краін і аналіз размеркавання пасажырапатокаў паказвае, што ўдзельнікамі і заўзятарамі пераважна будуць выкарыстоўвацца чартарныя рэйсы. У сувязі з гэтым з замежнымі авіякампаніямі прапрацавана пытанне аб дадатковых рэгулярных і чартэрных рэйсах у перыяд правядзення чэмпіянату свету, якія плануюцца.

Да 1 мая неабходна павялічыць колькасць стаянак са штучным пакрыццём для паветраных суднаў (з 45 да 67). Пры неабходнасці бізнес-самалёты будуць абслугоўвацца ў аэрапорце «Мінск-1», дзе маецца 20 месцаў стаянак паветраных суднаў. У Нацыянальным аэрапорце Мінск з пачатку красавіка ўводзіцца ў эксплуатацыю аўтаматычная сістэма апрацоўкі багажу, якая мае пяцівзроўневы кантроль бяспекі. Яна дазваляе апрацоўваць пры максімальных пікавых нагрузках каля 3,6 тысячы адзінак багажу ў гадзіну.

У рамках рэканструкцыі будынка аэравакзальна комплексу ўстаноўлена і абсталявана ўсімі неабходнымі камунікацыямі, сродкамі ахоўнай сігналізацыі і сувязі 11 кабін пагранічнага кантролю, уведзена ў эксплуатацыю 8 ліфтаў, устаноўлены новыя сядзенні для пасажыраў. Устаноўлены інфармацыйныя стойкі для абслугоўвання асоб з абмежаванымі магчымасцямі. Праведзена рэканструкцыя рэстарана «Лайнер», адкрыты дадатковыя аб'екты грамадскага харчавання. З 10 лютага вядзецца абслугоўванне пасажыраў у абноўленай зале прылётаў. Завершаны работы па ўладкаванні і тэхнічным аснашчэнні новай тэрыторыі залы афіцыйных асоб і дэлегацый. Створаны індывідуальныя зоны для абслугоўвання пасажыраў катэгорыі VIP/CIP.

Графік цягнікоў гарадскіх ліній прадугледжвае інтэрвальнасць іх курсіравання ў 10-15 хвілін, троххвілінную стаянку на прыпыначных пунктах «Масюкоўшчына» і «Лошыца» для пасадкі і высадкі балельшчыкаў.

Дарогі кажуць «welcome»

Да 30 сакавіка плануецца прывесці ў парадак рэспубліканскія аўтамабільныя дарогі і палосы іх адводу.

З мэтай вызваліць карыстальнікаў платных аўтамабільных дарог, якія выкарыстоўваюць транспартныя сродкі, зарэгістраваныя на тэрыторыі дзяржаў, што не ўваходзяць у Мытны саюз, з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не больш за 3,5 тоны, і буксаваных імі прычэпаў ад платы за праезд па платных аўтамабільных дарогах у перыяд з 25 красавіка па 31 мая, у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь унесены на разгляд адпаведны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У Мінску для паляпшэння транспартнага абслугоўвання ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату праведзена мадэрнізацыя сеткі транспартных камунікацый. Пабудавана сем аб'ектаў дарожнай інфраструктуры: чатыры транспартныя развязкі, пуцепровад і два масты.

Работнікі ДП «Мінсктранс», Нацыянальнага аэрапорта Мінск, станцый «Мінск-Пасажырскі» і «Брэст-Цэнтральны» прайшлі навучанне на курсах англійскай мовы. Выдадзены спецыяльныя размоўнікі для персаналу Беларускай чыгункі, работнікаў паветранага і аўтамабільнага транспарту. На вакзалах станцый «Мінск-Пасажырскі», «Брэст-Цэнтральны» і «Гродна» аб'явы, звязаныя з прыбыццём і адпраўленнем цягнікоў міжнародных зносін, вядуцца на беларускай, рускай і англійскай мовах.

На 18 прыпыначных пунктах гарадскога пасажырскага транспарту Мінска, прылеглых да месцаў правядзення спаборніцтваў, устаноўлены інфармацыйныя электронныя табло з адлюстраваннем інфармацыі на рускай і англійскай мовах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Транспартны вектар

За праезд давядзецца плаціць больш

Днямі ў інтэрнэце з'явілася інфармацыя аб тым, што з 1 красавіка адна паездка ў сталічным грамадскім транспарце падаражэе з 3 да 3,7 тысячы рублёў.

— Мы непасрэдна не займаемся павышэннем тарыфаў на праезд, да нас толькі прыходзіць рашэнне аб гэтым, — патлумачыла памочніца генеральнага дырэктара дзяржпрадпрыемства «Мінсктранс» Зоя Лабатая. — Пакуль афіцыйнае рашэнне не прынята, на гэты конт нічога сказаць нельга, — адзначыла яна.

Як стала вядома пазней, звесткі пра павышэнне аказаліся праўдай. Па інфармацыі прэс-службы Мінгарвыканкама, з 1 красавіка ў сталіцы зменяцца тарыфы на праезд у грамадскім транспарце. Адна паездка цяпер сапраўды будзе каштаваць 3,7 тысячы рублёў. Квіток, набыты ў вадзіцеля, абыдзецца пасажыру ў 4 тысячы рублёў. Быў агучаны таксама і новы кошт праязных. Так, праязны на месяц на адзін від транспарту можна будзе набыць за 166,5 тысячы рублёў, а на чатыры віды транспарту на такі ж тэрмін — за 299,7 тысячы рублёў. У праязных на пэўную колькасць паездак свая «коштавая палітыка». Напрыклад, за магчымасць карыстацца транспартам 10 разоў давядзецца аддаць 35,2 тысячы рублёў, а за 60 паездак — 188,7 тысячы. Як удакладнілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама, да 1 красавіка яшчэ можна набыць праязны па ранейшым тарыфе.

Трэба сказаць, што апошні раз аплата за праезд у сталіцы павялічвалася ў снежні мінулага года. Тады кошт адной паездкі з 2,5 тысячы рублёў «падрос» да 3 тысяч.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Летні расклад, новыя авіярэйсы — сезон стартуе!

З 30 сакавіка авіякампанія «Белавія» пераходзіць на летні расклад, які будзе дзейнічаць да 25 кастрычніка. У надыходзячым сезоне «Белавія» адкрые два новыя кірункі, павялічыць частату выканання палётаў па ўжо дзейных маршрутах і традыцыйна ўвядзе сезонныя рэйсы.

Так, з 28 красавіка палёты ў аэрапорт «Ніца Блакітны бераг» (Францыя) будуць даступныя пасажырам авіякампаніі тройчы на тыдзень: па панядзелках, чацвяргах і суботах. Першы самалёт «Белавія» прызямліцца ў міжнародным аэрапорце Краснадара (Расія) 30 красавіка. Туды будуць выконвацца тры рэйсы на тыдзень: па панядзелках, серадах і пятніцах.

У летні перыяд павялічыцца частата выканання ўжо існуючых рэйсаў. Рэйсы ў Парыж, Прагу і Астану будуць выконвацца штодзённа, рэйсы ў Амстэрдам — шэсць разоў на тыдзень, а рэйсы ў Кіеў — двойчы на дзень. Акрамя таго, самалёты авіякампаніі будуць выконваць палёты ў Барселону, Будапешт, Белград, Самару, Франкфурт з частатой тры разы на тыдзень, у Батумі і Ларнаку — чатыры, а ў Варшаву — пяць разоў на тыдзень.

У перыяд правядзення чэмпіянату свету па хакей будуць дадатковыя рэйсы ў Стакгольм, Парыж і Барселону.

У курортны сезон «Белавія» выконвае рэйсы ў Манчэстар, прадоўжыць палёты ў Калінінград з Брэста, Гомеля і Гродна. Таксама ў летнія месяцы пасажыры авіякампаніі змогуць скарыстацца магчымасцю авіяпералёту з Мінска ў Гомель двойчы на тыдзень — па серадах і суботах.

У надыходзячым сезоне авіякампанія плана выканаць на 30 працэнтаў чартарных авіяперавозак больш у параўнанні з леташнім сезонам.

Ад'езд з Мінска — з іншага месца

У сувязі з закрыццём у сталіцы аўтавакзала «Маскоўскі», з 1 красавіка рух аўтобусаў па міжгародніх і прыгарадных маршрутах, якія абслугоўваюцца «Мінаблаўтатрансам», будзе ажыццяўляцца ад дыспетчарскай станцыі «Славінскага» і аўтавакзала «Цэнтральны».

Ад ДС «Славінскага» будуць абслугоўвацца маршруты: Мінск — Барысаў, Мінск — Вілейка праз Плешчаніцы, Мінск — Вілейка праз Даўгінава, Мінск — Вілейка праз Бараўляны, Мінск — Жодзіна, Мінск — Жодзіна (воінская часць), Мінск — Даўгінава, Мінск — Крамянец, Мінск — Куляшы, Мінск — Лагойск, Мінск — Плешчаніцы, Мінск — Плешчаніцы праз Скароды, Мінск — Смалявічы.

Ад АВ «Цэнтральны» з 1 красавіка з Мінска будуць хадзіць аўтобусы па маршрутах: Мінск — в.Нарач, Мінск — АВ «Нарач», Мінск — сан. «Сосны», Мінск — Свір, Мінск — Вілейка праз Ілью, Мінск — Вілейка праз Ждановічы.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ПОЎНЫ ДВОР ДВОРАВЫХ

Пра дзяцей, іх выхавальнікаў, добрых банкіраў і... «левы» абутак

Карэспандэнт «Звязды» пабываў у адзіным у Гарадоцкім раёне дзіцячым доме сямейнага тыпу. Тут муж і жонка Дворавы выхоўваюць 10 дзяцей ва ўзросце ад 6 да 15 гадоў.

З гасцямі з банка і з МНС.

А ў нашай хаце госці

У межах акцыі «МНС і «Белая Русь» — за бяспеку дзяцей» у гэты дзень у дзіцячым доме пабывалі госці, якія паказалі дзецям спектакль і зрабілі карысныя падарункі: машынкі, настольныя гульні і нават вогнетушыцель.

— Нас, упэўнена, з вялікім нецярпеннем чакаюць дзеці: Ульяна, Вадзім, Паліна, Іван, Алена, Ксенія, Алеся, Таня, Павел і Віка. Іх выхоўваюць Ганна Пятроўна і Яўген Генадзевіч Дворавы. Жывуць яны ў катэджы, пабудаваным за грошы Беларусбанка. Усяго на краіне 13 такіх шыкоўных двухпавярховых дамоў сямейнага тыпу, у тым ліку два — у Віцебскай вобласці: у Гарадку і Оршы. Абодва наведваем сёння разам з пажарнымі. А летась мы рэалізоўвалі аналагічны праект з ДАІ, — расказвае па дарозе да дома Алена Асмалоўская, начальнік аддзела ідэалогіі Беларусбанка, аўтарка ідэі і куратарка праекта.

Паводле слоў Алены Асмалоўскай, грамадскімі арганізацыямі банка — прафсаюзнай, Саюза жанчын, БРСМ, «Белай Русі» — падтрымліваецца сувязь з выхавальнікамі і дзецьмі. Апошняя з пералічаных тры разы на год праводзіць акцыі. Да Дня абароны дзяцей летась батуты дарылі; да Дня ведаў сем'і запрашалі ў Мінск для сустрэчы з кіраўніцтвам банка (дарылі планшэты, электронныя кнігі, звадзілі ў цырк на аўстралійскіх артыстаў); да Новага года — ёлкі і салодкія падарункі...

— У год юбілею вызвалення краіны плануем зладзіць патрыятычную акцыю для дзятвы з нашых дамоў сямейнага тыпу. Хочам арганізаваць экскурсіі па знакавых месцах, якія ёсць у кожнай вобласці. Напрыклад, у Брэсцкую крэпасць, — дзеліцца планамі Алена Асмалоўская.

Так загаварыліся з ёй, што і не заўважылі, як прыехалі ў Гарадок.

Педагог па прызванні

Пакуль пажарныя ў гульнявой форме расказвалі дзецям пра тое, як неабходна прытрымлівацца правілаў, каб не здарылася бяды, на кухні пагутарыў з мужам і жонкай Дворавымі. Адказвалі яны на пытанні шчыра. І нават пра сумнае — з гумарам. Добрай энергетыкай ад гэтых людзей зарадзіўся надоўга. Сярод усіх іх выхаванцаў толькі Ксенія — родная дачка.

— Вядома, дзецям, акрамя сваёй роднай дачкі, якой летась споўнілася 10 гадоў, юрыдычна я чужы чалавек, педагог-выхавальнік. За сваю працу «мамай» атрымліваю заробак. Працавала раней у дзіцячым доме ў Езярышчы — выхавальніцай і інструктарам па працы. Маёй старэйшай дачцэ ўжо 26, замужам. 25-гадовы сын таксама хутка ажэніцца. Дзіцячы дом закрываўся, а трэба ж было дзесьці працаваць. Прапанавалі мне пасаду ў доме сямейнага тыпу. Муж працуе ў сістэме ЖКГ. Раней жылі ў Езярышчы — у 4-пакаёвай кватэры, — расказвае Ганна Пятроўна. Яе сваякі выдатна ўспрынялі навіну пра тое, што яна будзе «мамай» для дзесяці дзяцей. Прыязджаюць з падарункамі. Ганна сама з сям'і, дзе пяць дзяцей. І муж яе — са шматдзетнай...

Сказала, што ёй было цікава ўзначаліць дом сямейнага тыпу.

— Ужо трэці год пайшоў, як тут жывём. Дакладна памятаю, што 27 жніўня пераехалі. А афіцыйна адкрыццё было ў Дзень абароны дзяцей. Ключы атрымалі, але шмат што яшчэ прыйшлося потым дарабляць, каб можна было жыць. Прыемна было ўбачыць, што ў доме стаялі новы халадзільнік і многае іншае. Расстаўлялі ўсё і вешалі. Зямлю на ўчастак прывозілі, — успамінае яна.

— Мы не скардзімся, дом вельмі добры, плошчай больш як 300 квадратных метраў. Але ёсць шэраг недапрацовак. Напрыклад, паклалі чырвоную цэглу там, дзе трэба было больш стойкія да вільгаці матэрыялы прымяніць. І цэгла тая рассыпаецца. Балкон зроблены так, што працякае... Можа, таму, што першы ў раёне дом і пакуль адзіны? — дадае муж.

А ці прыязджаюць біялагічныя бацькі да дзяцей?

— Так! Праўда, браць назад у сям'ю да сябе не хочуць. Як і сваякі дзяцей. Прыедуць з падарункамі, сустрэнуцца і паедуць дамоў. А па законе ж можна зноў стаць паўнапраўнымі бацькамі, калі няма падстаў адмовіць... Звычайна бацькі і сваякі дзяцей тэлефануюць папярэдне, каб дамовіцца аб сустрэчы. Мы ж не заўсёды можам прыняць такіх гасцей. Неяк тэлефанавалі, а мы збіраліся ў кіно ў Віцебск. А мама і бабуля Баранавых, самых меншых, раней раз на месяц прыязджалі, цяпер радзей. Дык і дзеці не хочуць да іх вяртацца. Кажуць, што ім у нас лепей. Але ж сувязь з біялагічнымі бацькамі павінна заставацца. Дарэчы, не ўсе бацькі — выпівохі і гэтак далей. У нас выхоўваюцца дзве сястры, мама якіх цяжка хворая, — гаворыць Ганна.

«У дзяцей — дзве нагі»

Пытаўся, як ставяцца жыхары райцэнтра да Дворавых, дзяцей. Можа, нехта і не падтрымлівае іх ініцыятыву выхоўваць чужых дзяцей, а іншыя, магчыма, зайздросцяць таму, што сям'я жыве фактычна ў палацы?

— Многія дапамагаюць, а работнікі Беларусбанка — нашы самыя лепшыя сябры. Мікрааўтобус падарылі! Мы ж хацелі яго ў крэдыт купіць, па магчымасці на льготных умовах. Цяпер, калі ў школу, садок завезці трэба, усе змяшчаюцца.

Многія жыхары райцэнтра добра ставяцца да нашай вялікай сям'і. Але ёсць і такія, якія лічаць, што ў Дворавых грошай шмат. Я ім кажу: «Мой заробак «чыстымі» сёння — каля 4 мільёнаў рублёў за месяц. Дадайце 1,5 мільёна рублёў дзяржаўнай дапамогі на кожнае дзіця. Перыядычна аказваецца дапамога на пакупку дробязяў: бялізны і гэтак далей. Бярыце дзяцей, і вы будзеце атрымліваць «шмат»... Добрыя людзі часта дапамагаюць. Адна жанчына садавіну прывозіць. Іншыя прыносяць рэчы... Праўда, быў выпадак, калі кінулі ў двор вялікі мех з ботамі, і ўсе — з левай нагі. А дзе на правую? Мы цяпер, калі абцас трэба падрамантаваць, набойкі зрабіць, выкарыстоўваем той абутак. Можа, гэта прадпрымальнікі нейкія пажартавалі? Муж на прынтары раздрукаваў аб'яву, якую наклеілі на слуп ля цэнтральнага ўваходу на рынак. Тэкст прыкладна такі: «Дарагія прадпрымальнікі, вялікі дзякуй вам за ўсё! Але ў нашых дзяцей ногі розныя, ёсць і правыя», — расказвае гаспадыня дома.

Паказалі і дом: спальні, гасцёўню, два ванныя пакоі, чатыры прыбіральні... Дворавы сказалі, што выхаванцы дапамагаюць наводзіць парадак, з задавальненнем спрабуюць кухарыць. З інтарэсам вучацца будучаму самастойнаму даросламу жыццю. На агародзе разам вырошчваюць агуркі, буракі, моркву, цыбулю, клубніцы і суніцы... Дзве яблыні пасадзілі, грушу і вішню. І кветак шмат можна будзе ўбачыць, калі пацяплее. Іх двор нездарма тутэйшыя называюць «кветкавым».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.

■ Пытальнік

ШУКАЮ ПАЦВЯРДЖЭННЕ ЗНАХОДЖАННЯ ЦЕСЦЯ Ў КАНЦЛАГЕРЫ...

Паважаная рэдакцыя! Набліжаецца Дзень Перамогі і 70-годдзе з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У маёй сям'і таксама перажывае і ветэран вайны, і колішні вязень канцлагера. Толькі пра гэта, акрамя блізкіх родных, амаль ніхто не ведае. Гэта бацька маёй жонкі Васілеўскі Тамаш Уладзіслававіч, якому 23 верасня мінулага года споўнілася 90 гадоў. На фронце ён не быў, ды і ў партызанах (партызанская брыгада імя Калініна, Сафронаўскі атрад № 3, камандзір узвода — Сіманаў, камандзір аддзялення — Пашкевіч, — па словах Васілеўскага Т.У.) прабыў нядоўга, паколькі падчас карнай экспедыцыі вясной 1944 года трапіў у палон. Потым быў канцлагер для ваеннапалонных: спачатку ў Германіі, потым у Нарвегіі. Назваў канцлагераў не ведае. Памятае толькі, што ў Нарвегіі канцлагер знаходзіўся за 20 кіламетраў ад г. Трондхейм. А вось пройдзены шлях прыгадвае вельмі часта: і як уступіў у партызаны, і як трапіў у палон, і як паўмесяца везлі ў закрытых вагонах у канцлагер, і як прагна пілі ваду з мазутам па прыбыцці ў Германію, і як з'елі ўсю лебяду і іншую траву на тэрыторыі канцлагера, і як па раніцах забіралі ў крэматорый тых, хто не змог падняцца з нар, і як дастаўлялі ў Нарвегію. А потым — вызваленне і цяжкі шлях на радзіму. Цяжкі таму, што сустракалі вязняў як здраднікаў...

Я доўга спрабаваў знайсці ў інтэрнэце якую-небудзь афіцыйную інфармацыю па гэтым пытанні. І вось у нямецкіх архівах адшукаў спіс вязняў канцлагераў. А ў ім радок — Васілеўскі Тамаш Уладзіміравіч, 26.09.1923 года нараджэння. Месца нараджэння: Вілейка/Цярэчкі-Жаркава. У інфармацыі невялікія недакладнасці: сапраўдная дата нараджэння не 26, а 23, вёска — не Цярэчкі, а Цярэшкі, ну, а Жаркова, мне падаецца, павінна быць Шаркова, гэта значыць, Шаркаўшчына. Мяркую, гэта памылкі перакладу і не зусім дакладныя запісы. А Вілейка — гэта абласны цэнтр Вілейскай вобласці, у якую ўваходзіла і вёска Цярэшкі Шаркаўшчынскага раёна.

Прашу дапамагчы пацвердзіць гэтую інфармацыю і ўстанавіць ісціну. Вельмі хацелася б даведацца, у якіх канцлагерах пабываў мой цесць. І, калі магчыма, пацвердзіць яго членства ў партызанскім атрадзе. У ім (са слоў Тамаша Уладзіслававіча) ён быў пад прозвішчам Высоцкі, паколькі існавала небяспека, што, калі інфармацыя патрапіць да немцаў, сям'ю спаліць. У спісах ваеннапалонных фігурыруе імя па бацьку Уладзіміравіч, а не Уладзіслававіч. Так ён і лічыў, так яго называлі і на працы. І свайго бацьку ён заўсёды называў і называе Уладзімірам, хаця ў паўторным пасведчанні аб нараджэнні і ў пашпарце фігурыруе імя па бацьку Уладзіслававіч.

Ні ў якой матэрыяльнай дапамозе Тамаш Уладзіслававіч патрэбы не мае, але аднавіць гістарычную справядлівасць вельмі хацелася б.

Вінцэнт Часлававіч ДАВЫДЗЁНАК,
г.п. Шаркаўшчына.

Свае пошукі мы пачалі з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, звярнуўшыся туды з запытам. Вось які афіцыйны адказ атрымалі.

«У дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь звестак аб удзеле Васілеўскага Тамаша Уладзіслававіча (Уладзіміравіча) у партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны не знойдзена.

У дакументах архіўнага фонду «Беларускі штаб партызанскага руху» ёсць звесткі пра тое, што Высоцкі Тумаш (так у дакументах) Уладзіміравіч, 1924 года нараджэння, беларус, беспартыйны, адукацыя 4 класы, з 5 красавіка 1944 года па 3 чэрвеня 1944 года значыўся радавым 3-га партызанскага атрада брыгады ім. М.І.Калініна колішняй Вілейскай вобласці. З чэрвеня 1944 года Высоцкі Т.У. прапаў без вестак.

Адрас яго сям'і ўказаны: вёска Цярэшкі, Шаркаўшчынскі раён.

II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	1 066	574
в том числе: материалы	211	783	571
готовая продукция и товары	214	283	3
Расходы будущих периодов	230	91	70
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	33	1
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	3 030	1 928
Денежные средства и их эквиваленты	270	391	455
Прочие краткосрочные активы	280	-	2
ИТОГО по разделу II	**290**	**4 611**	**3 030**
БАЛАНС	**300**	**8 617**	**6 477**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2013 г.	На 31 декабря 2012 г.
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	1 505	1 505
Добавочный капитал	450	3 304	2 735
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	1 970	834
ИТОГО по разделу III	**490**	**6 779**	**5 074**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	115	170
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	1 723	1 233
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	24	284
по авансам полученным	632	382	
по налогам и сборам	633	433	162
по социальному страхованию и обеспечению	634	263	200
по оплате труда	635	605	564
прочим кредиторам	638	16	23
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**1838**	**1403**
БАЛАНС	**700**	**8 617**	**6 477**

ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь – декабрь 2013 года

Наименование показателей	Код строки	За январь - декабрь 2013 года	За январь - декабрь 2012 года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	18851	12 095
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(14 004)	(9 585)
Валовая прибыль (010-020)	030	4 847	2510
Управленческие расходы	040	(1 978)	(1 209)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	2 869	1 301
Прочие доходы по текущей деятельности	070	38	27
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(1 069)	(634)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	1 838	694
Доходы по инвестиционной деятельности	100	49	-
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	35	
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	14	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(28)	-
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(28)	
Доходы по финансовой деятельности	120	245	-
прочие доходы по финансовой деятельности	122	245	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(18)	-
в том числе: проценты к уплате	131	(18)	
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130±140)	150	248	
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±150)	160	2 086	694
Налог на прибыль	170	(529)	(211)
Чистая прибыль (убыток) (± 160-170±180± 190-200)	210	1 557	482
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	607	873
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	2 164	1 356

Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 01.01.2014

П.5-6 Информация о дивидендах и акциях		с начала года	за аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	180	180
в том числе: юридических лиц	лиц	1	1
в том числе: физических лиц	лиц	179	179
Начислено на выплату дивидендов в данном отчётном периоде	млн. руб.	482	48,3
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	млн. руб.	348	21,5
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	352	141,30
Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги)	руб.	1017,98	62,6
Обеспеченность акции имуществом	тыс. руб.	19,8	14,83
7,8. Отдельные финансовые результаты			
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	млн. руб.	18851	12095
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	млн. руб.	15982	10794
Прибыль (убыток) до налогообложения, всего	млн. руб.	2086	694
в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	млн. руб.	2869	1301
в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности	млн. руб.	-1031	-607
в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	млн. руб.	248	0
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	млн. руб.	529	211
Чистая прибыль (убыток)	млн. руб.	1557	483
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	млн. руб.	1970	834
Среднесписочная численность, чел.		170	187

П. 9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20% и более выручки от реализации работ - ремонт и техническое обслуживание подъёмного и такелажного оборудования, включая лифты.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный 2013 год, – 28.03.2014 г.

Аудиторское заключение: аудитор – ИП Букова Ольга Сергеевна (390436228). Бухгалтерская отчётность ОАО «Новополоцклифт», сформированная в соответствии с требования законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учёту и отчётности, достоверно во всех существующих аспектах отражает финансовое положение ОАО «Новополоцклифт»на 01.01.2014 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2013 год.

Директор **Д.Н. Шевчук**
Главный бухгалтер **Е.А. Костромичёва**

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ИНСТИТУТ БЕЛГИПРОАГРОПИЩЕПРОМ» (УНП 100597138)

220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 1, комн. 211, факс/тел. (375 17) 200 45 66, 200 12 72

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2014 года

Активы	Код строки	На 31.12.2013 года	На 31.12.2012 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	1 290	1 628
Нематериальные активы	120	11	11
Доходные вложения в материальные активы	130		
В том числе: инвестиционная недвижимость	131		
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133		
Вложения в долгосрочные активы	140		
Долгосрочные финансовые вложения	150	6	6
Отложенные налоговые активы	160		
Долгосрочная дебиторская задолженность	170		
Прочие долгосрочные активы	180		
ИТОГО по разделу I	**190**	**1 307**	**1 645**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	3 879	3 218
В том числе: материалы	211	369	406
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство	213	3 510	2 812
готовая продукция и товары	214		
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220		
Расходы будущих периодов	230	126	123
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	9	9
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	13 367	4 754
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и их эквиваленты	270	8	1 530
Прочие краткосрочные активы	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**17 389**	**9 634**
БАЛАНС	**300**	**18 696**	**11 279**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31.12.2013 года	На 31.12.2012 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	2 521	2 521
Неоплаченная часть уставного капитала	420		
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430		
Резервный капитал	440	320	317
Добавочный капитал	450	2 142	2 003
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	1 004	81
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		
Целевое финансирование	480		
ИТОГО по разделу III	**490**	**5 987**	**4 922**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520		
Отложенные налоговые обязательства	530		
Доходы будущих периодов	540		
Резервы предстоящих платежей	550		
Прочие долгосрочные обязательства	560		
ИТОГО по разделу IV	**590**		
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	15	
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	12 694	6 357
В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	1 276	239
по авансам полученным	632	7 983	4 815
по налогам и сборам	633	1 477	324
по социальному страхованию и обеспечению	634	412	238
по оплате труда	635	1 504	714
по лизинговым платежам	636		
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637		
прочим кредиторам	638	42	27
Обязательства, предназначенные для реализации	640		
Доходы будущих периодов	650		
Резервы предстоящих платежей	660		
Прочие краткосрочные обязательства	670		
ИТОГО по разделу V	**690**	**12 709**	**6 357**
БАЛАНС	**700**	**18 696**	**11 279**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2013 ГОД

Наименование показателей	Код строки	За январь-декабрь 2013 г.	За январь-декабрь 2012 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	29 376	25 142
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	22 098	20 722
Валовая прибыль (010 – 020)	030	7 278	4 420
Управленческие расходы	040	4 118	3 253
Расходы на реализацию	050		
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	3 160	1 167
Прочие доходы по текущей деятельности	070	123	163
Прочие расходы по текущей деятельности	080	1 975	958
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	1 308	372
Доходы по инвестиционной деятельности	100	289	8
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	8	1
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102		
проценты к получению	103	281	6
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104		1
Расходы по инвестиционной деятельности	110	8	9
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	4	6
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	4	3
Доходы по финансовой деятельности	120	30	13
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	30	13
прочие доходы по финансовой деятельности	122		
Расходы по финансовой деятельности	130	56	98
В том числе:			
проценты к уплате	131	24	88
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	32	10
прочие расходы по финансовой деятельности	133		
Иные доходы и расходы	140		

Наименование показателей	Код строки	За январь-декабрь 2013 г.	За январь-декабрь 2012 г.
1	2	3	4
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140)	150	255	-86
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150)	160	1 563	286
Налог на прибыль	170	569	200
Изменение отложенных налоговых активов	180		
Изменение отложенных налоговых обязательств	190		
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	3	5
Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200)	210	991	81
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	120	204
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230		
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	1 111	285
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	1 731	142
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260		
Количество организаций получивших прибыль по конечному финансовому результату	270	1	1
Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату	270a	991	81
Количество организаций получивших убыток по конечному финансовому результату	280		
Сумма полученного убытка по конечному финансовому результату	280a		

Расшифровка прочих доходов и расходов по текущей деятельности

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период прошлого года	
Наименование	код	доход	расход	доход	расход
1	2	3	4	5	6
Доходы, связанные с государственной поддержкой, направленной на приобретение запасов, оплату выполненных работ, оказанных услуг, финансирование текущих расходов (из строки 070)	300		X		X
Выплаты компенсирующего, стимулирующего характера , а также выплаты, носящие характер социальных льгот (из строки 080)	310	X	1551	X	761
Справочно:	2	3		4	
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг (с учетом налогов и сборов включаемых в выручку)	400	35 192		30 170	
в том числе: выручка полученная в иностранной валюте	400a	201		52	
Рентабельность продаж, %	410	8,98		3,87	

Данные отчетности подтверждены Обществом с ограниченной ответственностью «Белросаудит», зарегистрированным решением Минского горисполкома от 28.04.2000 г. № 465, свидетельство о государственной регистрации 600506719, УНП 600506719. Местонахождение аудиторской организации: 220030, Минск, ул. Комсомольская, д. 11/7.

По мнению аудиторской организации ООО «Белросаудит», бухгалтерская (финансовая) отчетность Открытого акционерного общества «Институт Белгипроагропищепром», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Открытого акционерного общества «Институт Белгипроагропищепром» на 1 января 2014 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2013 г., при этом совершенные Открытым акционерным обществом «Институт Белгипроагропищепром» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Пункты 5 -10 формы 1 «ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ», утвержденной Постановлением Комитета по ценным бумагам при Совете Министров Республики Беларусь от 16.12.2005 г. № 10/П.

Доля государства в уставном фонде эмитента ____96,8790_____ (всего, в процентах), в том числе:

Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде, %
Республиканская	554 955	96,8790

п.5. Количество акционеров, всего __113, в том числе юридических лиц ___1___, физических лиц ___112____

п.6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	517,84	45,83
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	904	80
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	10,45	8,59
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	-	-

п.7. Информация о задолженности (только в составе годового отчета):

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	6 374	2 330
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	1 088	332

п.9. Среднесписочная численность работающих (человек) ___234___

п.10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): ____проектно-изыскательские работы (ОКЭД 74201)_____

Руководитель **Булат Александр Георгиевич**
Главный бухгалтер **Каштанов Александр Анатольевич**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС На 01 января 2014 года

Организация	ОАО"Черметремонт"
Учетный номер плательщика	600068756
Вид экономической деятельности	Промышленность
Организационно-правовая форма	Частная с долей собственности государства в имуществе
Орган управления	ГО"Белресурсы"
Единица измерения	млн руб.
Адрес	223017 Минский р-н, п. Гатово

Активы	Код строки	На 31 декабря 2013 г.	На 31 декабря 2012 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	28 194	24 808
Нематериальные активы	120	7	1
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131		
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133		
Вложения в долгосрочные активы	140	19 745	
Долгосрочные финансовые вложения	150	1 100	1 100
Отложенные налоговые активы	160	8	
Долгосрочная дебиторская задолженность	170		
Прочие долгосрочные активы	180		
ИТОГО по разделу I	190	**49 054**	**25 909**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	18 240	8 451
В том числе:			
материалы	211	11 927	7 606
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство	213	5 329	783
готовая продукция и товары	214	984	62
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220		
Расходы будущих периодов	230	64	52
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	5	3
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	10 958	2 817
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и их эквиваленты	270	8 304	845
Прочие краткосрочные активы	280		
ИТОГО по разделу II	290	**37 571**	**12 168**
БАЛАНС	300	**86 625**	**38 077**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2013 г.	На 31 декабря 2012 г.
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	45 304	23 825
Неоплаченная часть уставного капитала	420		
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430		
Резервный капитал	440	95	44
Добавочный капитал	450	11 553	6 815
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	852	1 027
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		
Целевое финансирование	480		
ИТОГО по разделу III	490	**57 804**	**31 711**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520		
Отложенные налоговые обязательства	530		
Доходы будущих периодов	540		
Резервы предстоящих платежей	550		
Прочие долгосрочные обязательства	560		
ИТОГО по разделу IV	590	-	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	1 967	1 920
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	26 781	4 446
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	17 420	334
по авансам полученным	632	8 260	2 859
по налогам и сборам	633	121	397
по социальному страхованию и обеспечению	634	258	206
по оплате труда	635	642	623
по лизинговым платежам	636		
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637		
прочим кредиторам	638	80	27
Обязательства, предназначенные для реализации	640	73	
Доходы будущих периодов	650		
Резервы предстоящих платежей	660		
Прочие краткосрочные обязательства	670		
ИТОГО по разделу V	690	**28 821**	**6 366**
БАЛАНС	**700**	**86 625**	**38 077**

ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь-декабрь 2013 года

Наименование показателей	Код строки	За январь-декабрь 2013 года	За январь-декабрь 2012 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	18 708	47 465
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(15 786)	(38 319)
Валовая прибыль (010–020)	030	**2 922**	**9 146**
Управленческие расходы	040	(4 322)	(4 113)
Расходы на реализацию	050	(122)	(128)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030–040–050)	060	**(1 522)**	**4 905**
Прочие доходы по текущей деятельности	070	23 770	1 391
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(23 958)	(3 145)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070–080)	090	**(1 710)**	**3 151**
Доходы по инвестиционной деятельности	100	795	590
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	8	68
доходы от участия в уставном

Крамы побач з домам раім усім знаёмым

Сетцы прадуктовых крам ААТ «Постгандаль» сёлета спаўняецца 20 гадоў. Пра тое, як невялікім гандлёвым аб'ектам увесь гэты час удаецца вытрымліваць канкурэнцыю з гіпермаркетамі, мы пацікавіліся ў генеральнага дырэктара акцыянернага таварыства, дэпутата Мінгарсавета Сяргея СМОЛЬСКАГА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Сяргей Смольскі ўзначальвае ААТ «Постгандаль» (да 1994 года — Партызанскі райхарчгандаль горада Мінска) — першае ў сталіцы буйное недзяржаўнае акцыянернае таварыства ў галіне гандлю. З'яўляецца дэпутатам Мінгарсавета шасці склікання, намеснікам старшыні пастаяннай камісіі Савета па спажывецкім рынку, прадпрымальніцтве і рэкламе. Тэарэтычныя веды таваразнаўцы вышэйшай кваліфікацыі, эканаміста і эканаміста-менеджара ды багаты практычны вопыт дазваляюць Сяргею Аляксандравічу дастаткова сур'ёзна ўнікаць у дакументы, якія прымае гарадскі Савет, пры неабходнасці ўносіць прапановы па пытаннях, што разглядаюцца. Неабыякавы кіраўнік і дэпутат лічыць, што ў заканадаўчай дзейнасці важны ўдзел практыкаў, каб пазбегнуць памылак, якія могуць узнікнуць пры прымяненні прававых актаў у жыцці.

«ЗНАХОДЗІМ ПАДЫХОД ДА КОЖНАГА ПАКУПНІКА»

— Сяргей Аляксандравіч, у Мінску як грыбы пасля дажджу «растуць» гіпер- і супермаркеты. Як удаецца вытрымліваць канкурэнцыю, захоўваць рэнтабельнасць і не страціць давер свайго пакупніка?

— У кожнага пакупніка павінен быць выбар. Таму я за тое, каб у сталіцы працавалі як гіпермаркеты, так і невялікія крамы. Тым больш што канкурэнцыя толькі спрыяе развіццю гандлю. Галоўнае — граматна размясціць гэтыя аб'екты. Буйныя крамы, лічу, павінны ўзводзіцца на выездах з горада. Такая практыка распаўсюджана ў іншых еўрапейскіх краінах. Што тычыцца гандлёвай сеткі ААТ «Постгандаль», то яна налічвае сёння 19 невялікіх крам. Яны разлічаны, у першую чаргу, на людзей, якія жывуць непадалёку. Мы нават пазіцыянуем сябе менавіта як сетку крам крокавай даступнасці. Таму не дзіва, што нашы прадаўцы ведаюць сваіх пастаянных пакупнікоў у твар. У нашых крамах, калі ёсць такая неабходнасць, заўсёды дапамогуць выбраць тавар, а калі пастаянны пакупнік захварэў, то і прынясуць прадукты на дом. Людзі гэта цэняць, асабліва пажылыя. Наўрад ці такое магчыма ў супермаркетах, дзе большыя патокі людзей, дзе праца, хутчэй, нагадвае канвеер. І таму пакупнікі, якія цэняць менавіта ўвагу, чалавечыя стасункі і нават тыя, каму проста не хапае зносін, ідуць па пакупкі ў невялікія крамы. Акрамя таго, мы выратоўваем людзей ад непатрэбных пакупак і тым самым эканомім іх грошы. Бо ў гіпермаркетах, пагадзіцеся, больш спакус. У выніку чалавек набірае цэлы кошык прадуктаў, якія першапачаткова не планаваў набываць.

ААТ «Постгандаль» ЗАПРАШАЕ НА ПРАЦУ:

кантралёра-касіра, прадаўца, тавараведа, адміністратара гандлёвай залы, загадчыка таварнай секцыі, загадчыка крамы, намесніка загадчыка гандлёвай секцыі, бармена.

Больш падрабязную інфармацыю пра вакансіі і патрабаванні вы можаце знайсці на сайце http://www.posttorg.by.

— Што вашы прадаўцы цэняць кожнага кліента, я пераконваюся пастаянна, бо сама жыву непадалёку ад адной з крам ААТ «Постгандаль». Але, пагадзіцеся, толькі культуры абслугоўвання недастаткова, каб прывабіць патрабавальнага пакупніка. Чым кіруецеся пры падборы тавараў? Як я заўважыла, пераважная большасць прадуктаў на прылаўках айчыннай вытворчасці?

— Вы правільна заўважылі: у нас больш за 86% харчовых тавараў — беларускія. Астатнія, як правіла, крытычны імпарт — тое, што ў нас не вырабляецца ці вырабляецца ў недастатковай колькасці: гарбата, кава і г.д. Натуральна, што ў краме побач з домам на гандлёвай плошчы 100-300 метраў не можа быць прадстаўлены шырокі асартымент, як у гіпермаркеце. А гэтага і не трэба. Важна, каб тут былі асноўныя неабходныя прадукты. І каб не даводзілася стаяць у чарзе паўгадзіны дзеля пакета малака ды буханкі хлеба. Адным словам, мы імкнёмся зрабіць усё магчымае для таго, каб пакупнік мог набыць тавары першай неабходнасці з найбольшымі выгодамі і найменшымі затратамі часу. Для гэтага ў нас ёсць камерцыйны аддзел, які праводзіць вельмі сур'ёзную працу, каб высветліць пажаданні пакупніка, адбірае найбольш запатрабаваны асартымент. Пры выбары прадуктаў, якія трапяць на прылавак, дапамагаюць зносіны прадаўца з пакупнікамі. Варта адзначыць, што даследаванне пакупніцкага попыту праводзіцца па кожнай краме. Бо, як высветлілася, жыхары аднаго і таго ж раёна аддаюць перавагу розным вытворцам. Ды і плошчы нашых крам розныя.

— Заўважыла, што ў вашых крамах актыўна практыкуецца сістэма зніжак?

— Наша камерцыйная служба працуе ў гэтым кірунку. Практычна няма таго часу, каб у крамах ААТ «Постгандаль» не праходзілі нейкія акцыі па зніжэнні кошту. Інфармацыю аб распродажах і зніжках мы распаўсюджваем як непасрэдна ў крамах, так і праз інтэрнэт: у нас ёсць свой сайт.

— А вы самі актыўны пакупнік — я маю на ўвазе прадуктовыя крамы сеткі «Постгандаль»?

У магазіне № 25 «Тарты» на вуліцы Казлова.

— Я жыў у Партызанскім раёне 6 гадоў. Пасля пераехаў у Фрунзенскі раён, у бацькоўскі дом, дзе нарадзіўся. Тым не менш па-ранейшаму больш як 90% харчовых тавараў набываю ў крамах ААТ «Постгандаль». Па-першае, у мяне, як і ва ўсіх работнікаў акцыянернага таварыства, ёсць дысконтная карта зніжак; па-другое, я ведаю, што тут прадукцыя заўсёды якасная, свежая і па прымальных цэнах. У нашых крамах, акрамя прадуктаў, ёсць і так званыя «куткі гаспадыні», дзе можна набыць неабходныя гаспадарчыя тавары, у тым ліку гігіенічныя і мыйныя сродкі... У больш буйных крамах прадаюцца посуд і нават цацкі.

«МЫ АДКРЫТЫ ДА ЦІКАВЫХ ПРАПАНОЎ»

— Сяргей Аляксандравіч, ці плануеце пашыраць сваю сетку далей, ствараць новыя крамы ў фармаце «побач з домам»?

— Вядома, мы над гэтым працуем. Шмат дае зваротная сувязь. Я сустракаюся з выбаршчыкамі. Яны ведаюць, дзе і кім я працую, і шмат падказваюць, у тым ліку і ў галіне гандлю. Так, па просьбе жыхароў горада ў мікрараёне, дзе пабудаваны шэраг шматпавярховых дамоў і не хапае крам, «Постгандаль» набыў недабудаваны будынак пад новую краму. Пасля таго, як праектна-каштарысная дакументацыя пройдзе ўзгадненне, мы пачнём рэканструкцыю гэтага памяшкання. Калі будуць яшчэ нейкія цікавыя прапановы, мы гатовы іх разгледзець. Зразумела, што ў нас не такія фінансавыя магчымасці, як у замежных сетак, тым не менш мы — дастаткова рэнтабельнае гандлёвае прадпрыемства. Сёння ААТ «Постгандаль» — лідар продажу прадуктаў харчавання Партызанскага раёна сталіцы.

— А не думалі выйсці за межы раёна?

— У нас ёсць адна крама, № 47 — у Мінскім раёне, у Мачулішчах. У будучыні думаем выйсці не толькі за межы свайго раёна, але і за межы рэспублікі. У прыватнасці, адкрыць некалькі сваіх крам у Расіі. Калі казаць пра перспектывы, то мы сапраўды настроены на развіццё. Ужо сёлета з дазволу Мінгарвыканкама будзем выкупаць памяшканне крамы №44, якое пакуль арандуем. Укладаем штогод дастаткова вялікія грошы (сёлета амаль 3 млрд рублёў) у абнаўленне тэхналагічнага абсталявання ў нашых крамах. Калі мы акцыянаваліся (а гэта было ў 1994 годзе), у нас знос асноўных сродкаў у райхарчгандлі, у тым ліку халадзільнага і іншага гандлёвага абсталявання, быў звыш 90%. Сёння ён крыху перавышае 20%. Толькі па гэтых лічбах можна меркаваць, якая работа была праведзена за гэты час.

— Кадравая праблема сёння не абмінула і гандаль. Як вы яе вырашаеце?

— Мы не толькі актыўна супрацоўнічаем з навучальнымі ўстановамі, якія рыхтуюць прадаўцоў, касіраў, кантралёраў, тавараведаў, але і трымаем на прадпрыемстве супрацоўніка, якія займаецца павышэннем кваліфікацыі маладых спецыялістаў, што размяркоўваюцца да нас. Першае, што пакупніку кідаецца ў вочы, — узровень культуры абслугоўвання. Таму звяртаем увагу менавіта на гэта, распрацоўваем стандарты працы з пакупнікамі для ўсіх катэгорый работнікаў, якія задзейнічаны ў гандлёвай зале. Гэта тычыцца і сустрэчы пакупніка, і ўмення прапанаваць тавар, і абслугоўвання на касах. Дапамагчы пакупніку зарыентавацца сярод разнастайнасці тавараў і выбраць менавіта неабходны. Ён павінен не толькі ведаць спажывецкія якасці прадукцыі, але і прадбачыць пажаданні пакупніка. У крамах ААТ «Постгандаль» практыкуецца такая форма працы з кадрамі, як настаўніцтва, калі за маладымі работнікамі замацоўваюцца вопытныя спецыялісты. Лічу, што імідж прадаўца, прыцягальнасць прафесіі трэба павышаць за кошт зарплаты, сацпакета, конкурсаў прафесійнага майстэрства. Таксама неабходна са школьнай лавы праводзіць прафарыентацыю, расказваць пра тое, што гораду патрэбны не толькі будаўнікі, банкіры і юрысты, але і прадаўцы, кухары, афіцыянты.

Магазін № 6 на Уральскай вуліцы.

Да слова, работнікі ААТ «Постгандаль» неаднаразова перамагалі ў «Мінскім майстры», былі прызёрамі конкурсу, які праводзіць Міністэрства гандлю. Паводле слоў **старшыні прафкама Жанны ГАЎРОШ,** у акцыянерным таварыстве створаны ўсе ўмовы для кар'ернага росту. Яна распавяла пра маладых прадаўцоў, якія пасля перамогі ў конкурсах прафмайстэрства атрымалі павышэнне. Хтосьці з іх цяпер працуе тавараведам, адміністратарам... Лепшыя работнікі і калектывы заахвочваюцца прэміямі. Дошка гонару штогод абнаўляецца, а фотаздымкі раней адзначаных работнікаў змяшчаюцца ў Кнігу народнай славы арганізацыі. Традыцыйнымі сталі экскурсіі па Беларусі. Ёсць у арганізацыі і пакой псіхалагічнай разгрузкі для работнікаў (з масажным ложкам). Адным словам, кіраўніцтва ААТ «Постгандаль» стараецца рабіць усё магчымае, каб работнікі адчувалі сябе патрэбнымі, бо разумее, што для таго, каб прадаўцы дарылі ўсмешкі сваім пакупнікам, трэба, каб яны любілі сваю працу.

Цяпер сталіца актыўна рыхтуецца да чэмпіянату свету па хакеі. «Постгандаль» таксама не застанецца ўбаку. Будзе ўдзельнічаць у выязным гандлі падчас чэмпіянату. Ужо закупілі неабходнае абсталяванне. Таксама падрыхтавалі размоўнікі для прадаўцоў, праводзім спецыяльныя заняткі для персаналу.

Надзея ДРЫЛА, Аляксандр ФУРСАЎ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Загадчыца магазіна № 6 Таццяна КАЛТОВІЧ.

Загадчыца вытворчасці Алена ЖДАНОВІЧ і прадавец Марыя КОЖЫЧ каля вітрыны, дзе прадстаўлены паўфабрыкаты ўласнай вытворчасці.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» **віншуе генеральнага дырэктара ААТ «Постгандаль» Сяргея СМОЛЬСКАГА** з выбраннем у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў.

УНП 100036531

■ Запрашальнік

Залатыя мары пра «Песняроў»

Ёсць творчыя асобы і калектывы, якія не маюць патрэбы ў стасунках з публікай злоўжываць словамі «легендарны» і «культавы». Проста таму, што такімі насамрэч з'яўляюцца. З іх ліку і вакальна-інструментальны ансамбль «Песняры», створаны 45 гадоў таму ў Мінску Уладзімірам Мулявіным. Нязменны мастацкі кіраўнік звышпапулярнага музычнага гурта здзейсніў сапраўдны цуд: расіянін па паходжанні, ён сам стаў сімвалам беларускай нацыянальнай культуры і здолеў захапіць ёй жыхароў іншых савецкіх — і не толькі — рэспублік... «Песняры» задалі амаль недасяжную планку творчай працаздольнасці і прафесіяналізму, на якую дагэтуль арыентуюцца многія сучасныя музыканты.

Таму не дзіва, што нават больш чым праз 15 гадоў пасля распаду калектыву страсці вакол брэнда «Песняроў» не сціхаюць. Звычайны глядач блытаецца ў гуртах, якія прэтэндуюць на званне спадчыннікаў, — хто больш «сапраўдны». Але ў іх няма мэты быць мулявінскімі «Песнярамі»...

Дырэктар калектыву Ігар Кузняцоў, тым не менш, мяркуе, што зрабіць зборныя канцэрты — гэта ўсё ж не фантастыка, а цалкам выканальная задача. Калі будзе жаданне і зацікаўленасць ва ўсіх бакоў. «5 гадоў таму разам з адным з беларускіх тэлеканалаў мы зладзілі 4 вечары канцэртаў «Залатая калекцыя «Песняроў», — успамінае ён. — Усіх, каго мог, я сабраў, у тым ліку «Беларускіх песняроў», Валянціна Бадзьярава, Уладзіміра Ткачэнку. Калі атрымаецца, сёлета зробім другую спробу і зладзім у верасні вялікі фестываль з удзелам усіх зацікаўленых у культурным брэндзе Беларусі — ансамблі «Песняры». А проста на плошчы Перамогі ў Мінску мы прапанавалі Міністэрству культуры адкрыць культурны цэнтр, куды кожны чалавек зможа зазірнуць і паслухаць музыку «Песняроў», пазнаёміцца з гісторыяй калектыву, набыць сувенір».

Усе гэтыя ідэі цяпер абмяркоўваюцца і, хочацца верыць, хоць бы часткова ажыццявяцца. Каб замест знакамітага «песняроўскага» радка (які так і напрошваецца да гэтай сітуацыі) «Няма тога, што раньш было»... у сэрцы гучаў іншы: «...і там душою спачываю».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Не дзіва, што нават больш чым праз 15 гадоў пасля распаду калектыву страсці вакол брэнда «Песняроў» не сціхаюць. Звычайны глядач блытаецца ў гуртах, якія прэтэндуюць на званне спадчыннікаў, — хто больш «сапраўдны».

■ Простая мова

НЕ ТАКІ АДЗІНОКІ ТЫ ДНЁМ...

Што ні мабільнік, то свой «званок», свой, у прыватнасці, голас. Сярод самых нечаканых — «Мурка», «Перапёлачка», «Бухенвальдскі набат»... А яшчэ — брэх сабакі, спевы салаўя, пераклічка пеўняў... Мусіць, праўду кажуць: можна вывезці чалавека з вёскі, а вось вёску з чалавека не вывесці ніколі.

УРОК

Раніца. Сталіца. Скрыжаванне — у так званым спальным раёне яно ціхае, людзей няшмат. Але ж святлафор стаіць — з «ручным кіраваннем». Гэта значыць, хочаш перайсці на той бок праспекта — прыкладзі руку да адмысловай «клавішы», пачакай — машыны спыняцца.

Прыклала, чакаю.

— Зараз нам загарыцца зялёнае, і тады мы пойдзем, — чую за спінай. — А пакуль — трэба пастаяць: нам чырвонае, бачыш?

Гэта бацька, трэба разумець, — павучае дзіця?

Хацела зірнуць, хлопчыка ці дзяўчынку, якога ўзросту...

Побач з мужчынам, узняўшы морду, сядзеў сабака.

ВУСНАМІ ДЗІЦЯЦІ

Анекдот, які запомніць нават той, хто анекдотаў не помніць.

Бацькі з дачушкай селі ў аўтобус. Маці дастала апельсін, пачысціла, падала малой — скуркі шпурнула ў акно. Дзяўчынка ў крык:

— Мама, ну што ты робіш...

Пасажыры ўсцешана: «Во, нават дзіця разумее, што гэтак нельга!». Яно (і ў гэты ж час) завяршае фразу:

— ...Іх жа ў гарэлку класці трэба!

Анекдот, які варта запомніць. Ці нават... паспрабаваць: высушыць некалькі апельсінавых скурак, пакласці ў гарэлку.

Не ўсё ж за акно іх... Ці на распалку дроў...

СМАГА?

Субота, раніца і звычныя закупкі. Рабіць іх лепш у вялікіх крамах: там ніжэйшыя цэны, там болей тавараў...

Хоць, адпаведна, больш і людзей — розных: на выхадзе вось двое дзядзькоў штось незразумелае робяць з трэцім: не, здаецца, не б'юць?.. Не распранаюць? Нешта адбіраюць?.. Але ж той чамусьці не крычыць, не кліча на падмогу...

— Ніяк злодзей? — нясмела выносіць «прысуд» адзін з «гледачоў». — Мусіць, ахоўнікі на нечым злавілі.

І мелі рацыю, як аказалася, бо ўрэшце з «глыбінь» аб'ёмнай курткі дасталі-такі... пляшку каньяку. А следам — заламалі за спіну рукі, некуды павялі...

Праўдзівая прыказка: «Няма лепей, як украдзеш, няма горш, як зловяць».

«РЭЦЭНЗІЯ»

З правілаў жыцця: калі вам не тэлефануюць сябры — значыць, усё ў іх добра.

Каб пераканацца, сама (часцей па вечарах) набіраю патрэбныя нумары, пытаю найперш, ці не перашкодзіла, бо раптам чалавек заняты: можа, кіно якое глядзіць?

— Гэта раней фільмы паказвалі, — разважае ў адказ адна з сябровак. — Кожнае слова пачуць хацелася, бо яно ж важнае было, назаўтра цытавалі. А цяпер... Адну серыю паглядзеў, пяць прапусціў — і ўсё зразумела: нічога не страціў.

...Можа, нават прыдбаў?

БЫЎ... І НЯМА

Зручная рэч мабільнік!

— Я выехала, — заляцеўшы ў паўпусты аўтобус, далажыла камусьці юнае дзяўчо. — Праз пяць хвілін буду...

Хоць ёй (па ўсім відаць) хацелася раней, бо ад дзвярэй не адступіла, бо ва ўсе вочы глядзела ў акно — чакала...

І мела каго, бо хвілін праз пяць у аўтобус зайшоў такі прыгажун...

Яшчэ раз павіталіся.

— Прысядзем? — прапанавала дзяўчына, паказаўшы рукой на вольныя месцы.

— Давай, — ахвотна згадзіўся ён.

І нават збіраўся — рушыў за ёю следам. Але варта было дзяўчыне сесці...

Спаднічка ўсё сапсавала: кароткая, вузкая, яна раздрадніцку «нырнула» пад такую ж куртачку — «агаліла» сцёгны — усе, да таго ж, у светлых калготах...

Юнак, убачыўшы такую «прыгажосць», густа пачырванеў, разгубіўся і... ні слова не сказаўшы (дзверы якраз адчыніліся), выскачыў з аўтобуса.

НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

Шчасце — калі ёсць каму расказаць пра няшчасці.

— Ну як прайшоў твой дзень? — пытае вечарам муж.

Расказваю, што было дома, на працы, што ў абед, прынамсі, сустрэліся з сяброўкай, зайшлі ў буфет. Што папрасілі там два кубачкі кіпеню, дзве порцыі вяршкоў, адзін пакецік чорнай гарбаты (не, не з эканоміі, проста кубачкі маленькія і з двух — чай замоцны).

— Ну і што вам далі? — перапыняе чалавек.

— Нічога... Пакуль мы не патлумачылі, што *кубачак* — гэта *чашечка, кіпень — кіпяток,* а *гарбата — чай*...

Не хадзіць жа галодным!..

УСЕ БАБРЫ ДАБРЫ...

Дзед Вінцук прымаў віншаванні: яму 27 лютага 82...

А можа, і менш — 80, напрыклад? І нейкага снежня ці студзеня, бо дакладна вядома хіба тое, што нарадзіўся ён зімой ці то 32-га, ці то 33-га і ў чорта на рагах: яго дзеда з бабкай, яго бацькоў, трох цётак (амаль дарослых матчыных сясцёр) і дзядзьку (яе старэйшага брата) як сям'ю кулакоў саслалі некалі ў Архангельскую вобласць...

Саслалі, як потым дазналіся, па даносе мясцовага пустадомка, якога бабуля, шкадуючы, часта карміла, апранала і якога, калі нямецка-фашысцкая была, прасіла падмагчы — зрэдчас, за грошы. А ён потым данёс, што батрачыў на іх... Прычым пастаянна.

— Улада вінаватай была, не без таго. І шмат у чым. Але ж і людзі якія... Поедам елі адзін аднаго, — разважае цяпер дзед Вінцук.

І мае рацыю, бо палова яго сям'і з той ссылкі не вярнулася.

АПОШНЯЯ ДАРОГА

З ліста: «Мой свёкар быў страшэнна раўнівы і, калі яго жонка зацяжарала ў трэці раз, сказаў, што вось гэтае дзіця ён ніколі не прызнае, бо яно ад суседа... Свякроў тады паехала ў іншую вёску, каб зрабілі аборт. А пасля яго стала сыходзіць крывёю. Мужык, дазнаўшыся пра гэта, запрог каня і павёз яе ў бальніцу. Па дарозе жанчына памерла. Яе двое малых — мой будучы муж і яго маленькая сястрычка — засталіся без мамы...»

Ні слова ў лісце пра тое, ці запомніў яе дзеці, ці пыталіся ў бацькі, дзе яна. І чаму...

А цікава ж: што ён адказваў? Што думаў пры гэтым? Як часта ўспамінаў тую іх апошнюю дарогу да бальніцы?

І як потым жыў — з такім успамінам?

ШТО ТОЙ САЛДАТ, ШТО ГЭТЫ?

Горад і ўсе выгоды: да рынка, прынамсі, рукою падаць. Невялічкі ён і свой, мікрараённы: пакупнікі тут ведаюць гандляроў, гандляры — адпаведна...

— О, дзеду, добрай раніцы! — вітае аднаго з пакупнікоў досыць вабная маладзіца. — Вам чаго сёння ўзважыць? Сальцісону? Добра... Але ж вы абяцалі каўбасы ў мяне ўзяць — са «стыпендыі»?

— Абяцаў, — чухае патыліцу дзед, — але ж грошы як вада цяпер: атрымаў — за кватэру заплаціў, у аптэку схадзіў і ўсё, лічы: разышліся, няма з чым па каўбасы хадзіць. Трэба новай «стыпендыі» чакаць.

…Яе, трэба разумець, трохі лягчэй, чым пенсіі?

НЕ ТАКІ АДЗІНОКІ ТЫ ДНЁМ...

Чым цяплей на дварэ, тым больш народу ў вёсцы.

Ля крамкі во цэлы натоўп сабраўся. Дзверы пакуль зачынены: спазняецца прадавачка... Што пакупнікоў (пераважна — мужчын) не бянтэжыць: сонейка грэе, час пакуль ёсць — якая розніца, дзе лясы патачыць? На вуліцы яно, можа, і лепей: яна, прынамсі, мігам тэму падкіне. З-за касцёла вось «вынырвае» канёк (дзед яго за аброць вядзе): у вазку — бабуля, можна сказаць, баярыняй.

— Здароў быў, Мацвеевіч! — вітаюць старога мужчыны. — Ты ўсё пехам?.. Канёк машын пужаецца?.. Дык хай бы жонка яго правяла. Яна ж за цябе маладзейшая? Гадоў на дзесяць?..

— На трынаццаць, — удакладняе дзед, прывязваючы канька падалей ад дарогі. — Але ж яна, хлопцы, — баба: за дзень находзіцца, натоміцца — што з яе потым возьмеш? Вечарам галаву да падушкі і спаць, а так...

— Дзед, ну ты даеш! Ну ты зух! — здзіўляюцца, рагочуць мужыкі. — Табе ж за восемдзесят ужо! І што — ноччу баба трэба?

— А як жа, хлопцы! Больш, чым маладому...

— От жа трапло, — злазячы з воза, нападае на дзеда жонка. — Вы яго толькі слухайце! Ён вам не тое яшчэ раскажа!

Мужчыны, падобна, з дарагой душой — і паслухалі б (тэма цікавая!), і пагаварылі б, але ж прадавачка якраз з'явілася, дзверы адчыніла — рушылі ў краму. Таму дзедава досыць ціхае: «А што — я няпраўду кажу? Ну патрэбна ж баба! Ночы доўгія... З кім пагаварыць?» — пачулі хіба што адзінкі.

А яно ж і сапраўды:

«Даже в самой поре одиночества
Ты не так одинок еще днём.
Тяжелее всего — это «ночество»,
Заключённое в слове самом...»

Валянціна ДОЎНАР

ДЗЕНЬ «Т»

Героі для сучаснага тэатра: ад Соф'і Гальшанскай да Уладзіміра Мулявіна

Беларускай драматургіі на тэатральнай сцэне становіцца больш. Нашы тэатры сталі звяртацца да гістарычных асоб, да айчыннай класічнай літаратуры, увасабляючы яе ў сучасным прачытанні.

Але ж у тэатры хочацца ўбачыць і сябе збоку, праз пастаноўкі пра беларусаў XXI стагоддзя — і вось пакрысе прыходзіць на сцэну беларуская «новая драма», добра вядомая за межамі нашай краіны… Размовы пра стан айчыннага тэатральнага мастацтва ажыўляюцца напрыканцы сакавіка — бліжэй да Міжнароднага дня тэатра. Свята — гэта нагода не толькі для радасці, але і для пэўнага аналізу: куды наш беларускі тэатр рухаецца. І што ў ім ёсць уласна беларускага? Таму прысутнасць на айчыннай сцэне п'ес, опер, балетаў і мюзіклаў беларускіх аўтараў і стала сёлета галоўнай тэмай для абмеркавання.

Якія ж фантастычныя людзі — служыцелі тэатра! У іх свята, ім бы разняволіцца ды… А яны не пра сябе, а ўсё пра яго, гледача, клапоцяцца: ствараюць для яго капуснікі, прэм'еры, ладзяць сустрэчы. І разважаюць пра сваё самае балючае:

— Уявіце сабе, што мы, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Горкага, які вядомы як «рускі», вырашылі пражыць сезон з беларускай драматургіяй! — пераконваў **дырэктар тэатра Эдуард ГЕРАСІМОВІЧ.** — Калі нехта сумняваецца, што, маўляў, няма чаго ставіць, то мы тут іранізуем: беларуская класіка можа быць актуальная заўсёды. Напрыклад, Барыс Луцэнка ажыццявіў пастаноўку «Зацюканага апостала» Макаёнка. Спектакль атрымаў назву «Аракул». Быў аднойчы цікавы момант, калі мы атрымалі ананімную п'есу «Экзекутар» (працяг «Рэвізора»). Высветлілася потым, што аўтар яе Аляксей Дудараў, а працяг гогалеўскай тэмы аказаўся цікавы і актуальны для пастаноўкі на сцэне. Мы звяртаемся і да маладых беларускіх аўтараў. Мікалай Рудкоўскі напісаў інсцэніроўку паводле «Бесаў» Дастаеўскага. І можна сказаць, што наш тэатр сапраўды нацыянальны. Але нацыянальнае ў сучасным беларускім тэатры, на наш погляд, — гэта не толькі мова, а наогул прыналежнасць да пэўнай нацыі, актуальнасць тэм менавіта для яе. Мы сведчым: спектакль рускага драматычнага тэатра імя Горкага можа быць нацыянальным па духу. Такім, на нашу думку, павінен стаць новы праект «Пясняр», прысвечаны Уладзіміру Мулявіну, п'есу пра якога напісаў Васіль Дранько-Майсюк. Цяпер вырашаецца пытанне гэтай пастаноўкі з дапамогай дзяржфінансавання і часткова па-за бюджэтных сродкаў (спектакль даволі дарагі).

— Мы спрабуем і без вялікіх грошай нешта рабіць,— дадае **Аляксандр ПЯТРОВІЧ, дырэктар Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.** Напрыклад, у нас з'явіўся першы беларускі мюзікл «Соф'я Гальшанская» на музыку Уладзіміра Кандрусевіча, які карыстаецца цікавасцю ў публікі ў Мінску. Але гэты спектакль мы плануем паказаць 24 мая ў Гальшанах на адкрытай пляцоўцы: прывязём гісторыю людзям, якія дыхаюць яе паветрам, часам не думаючы пра гэта…

— У Вялікім тэатры оперы і балета ў апошнія гады з'явіліся цікавыя беларускія творы: гістарычная опера Яна Голанда «Чужое багацце нікому не служыць», опера Дзмітрыя Смольскага «Сівая легенда» і балет Вячаслава Кузняцова «Князь Вітаўт». У балеце з'явіўся цікавы сучасны спектакль на музыку Алега Хадоскі «Зала чакання». Мы не збіраемся спыняцца. Ёсць планы абнавіць оперу Уладзіміра Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха». Яна ёсць у афішы тэатра, але спектакль можа мець новае аблічча. Ёсць перспектыва, што будуць з'яўляцца іншыя беларускія творы: магчыма, балет Сяргея Картэса, які хацелася б паставіць у эксперыментальным стылі. Таксама цікавай падаецца опера Уладзіміра Солтана «Пані Ядзвіга», якая не была пастаўлена ў тэатры ў свой час. Але цяпер мы паглядзелі на яе па-новаму і вырашылі, што гэта можа быць цікава. Уладзімір Солтан — цудоўны кампазітар, меладыст. Калі б не заўчасная гібель, то яшчэ б нас шмат чым радаваў. Яго музыка падабаецца публіцы, таму мы вырашылі звярнуцца да непастаўленай оперы,— патлумачыў **Уладзімір РЫЛАТКА, намеснік дырэктара Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.**

— Наш тэатр калісьці ствараўся дзеля таго, каб прапагандаваць беларускую драматургію, якой на пэўным этапе было мала,— адзначыў **мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Аляксандр ГАРЦУЕЎ.**— Я б не сказаў, што гэтая праблема застаецца актуальнай да сёння. На ўсёй постсавецкай прасторы і нават па-за ёю гавораць пра маладых таленавітых аўтараў з Беларусі, якія ствараюць у рэчышчы «новай драмы». Нават у Манголіі ідзе спектакль паводле Дзмітрыя Багаслаўскага. У нас у тэатры ёсць адна пастаноўка «Ціхі шэпт сыходзячых крокаў». Я збіраюся паставіць п'есу «Любоў людзей». А ў маі плануем «Вечар сучасных беларускіх камедый». У тэатры розныя спектаклі павінны быць: не толькі тыя, якія ствараюцца «на публіку», каб людзі маглі адпачыць, але і сур'ёзныя, калі тэатр задае пытанні, абуджае да пошуку адказаў.

Калі мы маем наш беларускі тэатр, які існуе дзеля нашага грамадства, то разам са спектаклямі паводле сусветных аўтараў хочацца бачыць пастаноўкі, дзе ідзе размова пра наша жыццё, тых людзей, якія ствараюць сённяшнюю Беларусь, пра тое, чым яны жывуць і што для іх важна.

Ларыса ЦІМОШЫК.

«ХРУСТАЛЬНУЮ ПАЎЛІНКУ» — У ДОБРЫЯ РУКІ

Галоўную прафесійную тэатральную прэмію «Хрустальная Паўлінка» ў Міжнародны дзень тэатра атрымаў **народны артыст Беларусі Тадэвуш КОКШТЫС, які працуе ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа.**

«Хрустальны анёлак» за таленавітае жыццё ў лялечным тэатры прысуджаны **артысту Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Аляксандру КАЗАКОВУ.**

«Хрустальную зорку» за вялікі ўнёсак у развіццё тэатральнага мастацтва атрымала **рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага Валянціна ЕРАНЬКОВА.**

«Хрустальная кветка» за яркі дэбют уручана **артысту-вакалісту Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Аляксандру ГЕЛАХУ.**

■ Вернісажы

КОЛЕРЫ АЙЧЫНЫ

— …Вось наш крыж,— сказала бабуля дзяўчынцы і паказала, як трэба прыкладвацца да святыні.
— Прыгожы,— заўсміхалася дзяўчо.— А наш — гэта значыць мой?
— І твой таксама. Ён усім належыць.
Мінск. Дзяржаўны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Чацвер. Паломніцтва: толькі адзін дзень адкрыты для наведвальнікаў музея славуты Крыж Ефрасінні, які быў перастворaны напрыканцы XX стагоддзя брэсцкім ювелірам-віртуозам Мікалаем Кузьмічом. Сапраўдная рэліквія страчана. Але рэліквія з намі: у ёй усё, як у крыжы майстра Лазара Богшы, усе драбніцы і часцінкі святыняў. І адноўлены крыж — таксама святыня. Яна прыехала ў Мінск з Полацкага Свята-Ефрасіннеўскага манастыра толькі ў дні адкрыцця выставачнага праекта «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі». Выстава, якая стварае вобраз краіны тымі колерамі і адценнямі, што ёй найбольш пасуюць.

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Белы, як чысты аркуш

Гэты праект трэба было зрабіць: у XX стагоддзі нарадзіўся і прасоўваўся міф пра тое, што беларускае мастацтва ствараласа ў савецкі час. Гэта наогул бяда Беларусі, што падобныя міфы адлучылі нас ад вялікай часткі прафесійнай мастацкай культуры. І таму ствараласа ўражанне, што і ў выяўленчым мастацтве мы нічога не мелі, і ў музыцы — усё «не нашы», а літаратура ўзнікла, натхнёная рэвалюцыйнымі павевамі канца XIX — пачатку XX стст. І гэтак далей. Але ж вось, калі ласка: кніга Сімяона Полацкага «Посах кіравання» 1667 года выдання — зварот з нашых абшараў да суседніх, да тых, хто быў не супраць павучыцца ў ліцвінскага манаха. Пабачыць яе можна на выставе. Як і «Статут Вялікага Княства Літоўскага», вернуты на радзіму. А вось абразы — з калекцыі нацыянальнага мастацкага музея. Абразы нашы такія блізкія сэрцу: вельмі чалавечныя, а царскія вароты — як царскія падарункі таленавітага майстра Богу.

Талентамі зямля прырастае. Па талентах яе пазнаюць. З таленту і ўмення і жадання ствараць нешта і ўзрастае. Вось хоць бы



Яўген Зак «Арлекін (П'еро)».



Аляксандр Малей «Халодны жывапісны аб'ект», 2013 г.

на старажытныя ўпрыгажэнні паглядзець: з золата і звычайнага металу, але зробленыя так, што і цяпер бы царыцай у іх выглядала! Бранзалеты і завушніцы, ці яшчэ цікавая дэталь — скроневыя кольцы. Можна спакойна сучасным дызайнерам узяць ідэю на ўзбраенне: мода шукае арыгінальнае — дык чаму ж не ва ўласнай культуры?

У гэтым кантэксце ў Беларусі павінна пачацца мода на любоў да мастацтва. Калі штосьці ведаеш, то не можаш гэта не палюбіць. Выстава «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі» дазваляе і адкрыць для сябе тое, чаго ў свядомасці, можа быць, дагэтуль не было. Але ўсё можна зафіксаваць — на чыстым аркушы любое адценне бачыцца выразна.

Блакітны, як нябёсы

Праект у першую чаргу асветніцкі: усе набыткі айчыннай культуры за апошнія дзесяць стагоддзяў сістэматызаваны, падаюцца ў кантэксце эпох (ад візантыйскай традыцыі да найноўшых эпох, калі мастацтва стала развівацца ў дыялогу культур), знаёмяць з новымі найсучаснымі плынямі. Такі падыход дазваляе лепш зразумець: чаму некаторыя творы ўспрымаюцца як шэдэўры. Чаму яны насамрэч — шэдэўры. Праўда, перад арганізатарамі стаяла абсалютна недасягальная задача — паказаць усё багацце ў адным праекце. Аказалася, што паказаць ёсць што, даводзілася выбіраць тое, што найлепш сведчыць пра час і развіццё ў ім беларускай культуры. У выніку ў экспазіцыі прадстаўлены 500 экспанатаў з 29 музеяў краіны, карпаратыўных і прыватных калекцый.

— Наведвальнікі ўбачаць багацце беларускай гісторыі і ўнікальнасць культуры. Для таго, каб прадставіць усё, што хацелася, нам давялося зняць частку пастаяннай экспазіцыі (не хапала плошчаў),— адзначыў дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў.

Блакітны — колер светлых надзей. І яны спраўджваюцца дзякуючы таму, што ёсць

Гаўрыла Вашчанка «Юнацтва», 1971 г.

цікавасць да айчыннай культуры з боку тых, хто хоча бачыць краіну багатай у любым сэнсе. Пачаткам здзяйснення самых смелых мар і надзей была выстава з калекцыі «Белгазпрамбанка», якая знаёміла з творамі мастакоў парыжскай школы. Беларусь убачыла карціны тых, пра каго можна было чытаць: Суціна, Кікоіна, Царфіна ды іншых мастакоў, якія былі родам адсюль. І вось жа вяртаюцца сюды з асобнымі творамі, якія адшукваюць за мяжой і выкупаюць арганізацыі і нават прыватныя асобы з Беларусі. Напрыклад, твор Хаіма Суціна «Ева», які набылі на аўкцыёне Sotheby's за 1 мільён 860 тысяч долараў — самы дарагі экспанат. Але для выставы з ім прыйшлося папрацаваць рэстаўратарам. Таксама, як і з «Партрэтам паэта Тамаша Зана» (аўтарства беларускага рамантыка Валенція Ваньковіча). Да нядаўняга часу карцін гэтага мастака наогул не было ў Беларусі, але «Белгазпрамбанк» вярнуў гэты твор, набыўшы яго ў прыватнага калекцыянера. Насамрэч столькі імёнаў дала Беларусь свету, але, ствараючы недзе далёка, яны ўсё роўна неслі адценні зямлі, якая дала ім жыццё.

Насычаныя, як зямля

На лагатыпе выставы — дрэва ў разрэзе. Яшчэ адзін змястоўны сімвал — як слаі і гады ўтвараюць шырокі ствол. Глядзіш на дрэва — і не бачыш гэтых векавых кольцаў. А насамрэч яно такое магутнае нездарма. Усё складваецца: разнастайнае мастацтва XX стагоддзя (якое паўставала дзякуючы развіццю мастацкай адукацыі ў савецкі час) зайграла разам з творамі папярэдніх эпох — партрэтаў, пейзажаў вядомых і невядомых мастакоў.

